PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl

№ 3 (2436) Год XLVIII Беласток, 19 студзеня 2003 г. Цана 2,00 зл.

Паліўны закалот

Пачатак 2003 года на польска-беларускай граніцы пачаўся з пратэсту беларускіх шафёраў аўтафураў супраць рашэння Міністэрства фінансаў Польшчы аб абмежаванні ўвозу паліва на тэрыторыю Польшчы.

Бензін і дызельнае паліва ў Беларусі больш за 60% таннейшае, чым на сусветным рынку. Гэта прывяло да масавых прыватных паставак таннага паліва з Беларусі ў Польшчу. Асабліва гэтая з'ява вядомая ў мясцовасцях у прыгранічнай паласе, дзе без клопату можна купіць салярку ці бензін ад шафёраў легкавых аўтамабіляў. Такія гандляры не плацяць мыта і часта парушаюць правілы бяспекі пры перавозе гаручага. Змагаючыся з гандлярамі бензінам, Міністэрства парушыла інтарэсы буйных перавозчыкаў, што ў сваю чаргу выклікала пратэст.

Паводле новага закона, шафёры, якія ў баках машын увозяць больш за 200 літраў гаручага, павінны за звышнорму заплаціць мытную пошліну, акцызную аплату і падатак на дадатковую вартасць. Шафёры аўтафураў, якія адмовіліся перасякаць мяжу і апынуліся ў 14-кіламетровай чарзе на пагранпераходзе ў Казловічах, заявілі, што плаціць не будуць і прыгразілі, што лішкі паліва будуць спускаць з бакаў у прыдарожныя равы.

Склаўшаяся на граніцы сітуацыя выклікала дыпламатычную рэакцыю беларускага боку. Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве выдала ноту пратэсту ў сувязі з рашэннем Міністэрства фінансаў, а беларускае знешнепалітычнае ведамства заявіла, што калі польскі бок афіцыйна не адменіць абмежаванняў па колькасці паліва, якое дапускаецца грамадзянам Беларусі ўвозіць у баках аўтамашын, Беларусь можа прыняць „адпаведныя крокі" ў адносінах да польскіх перавозчыкаў. Намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Савіных прыпомніў, што рашэнне польскага боку парушае польска-беларускае пагадненне ад 1992 г. аб міжнародных перавозах. У 11 пункце гэтага дакумента напісана, што ўсё перавожанае ў баках паліва вызваляецца ад усялякіх аплат.

І сапраўды, Міністэрства фінансаў, прымаючы рашэнне аб дазволенай колькасці ўвожанага паліва, парушыла згаданае двухбаковае пагадненне. Пасля некалькіх дзён абмежаванне ўдалося зняць дзякуючы стараанням Міністэрства замежных спраў Польшчы, якое схіліла Міністэрства фінансаў прыпыніць сваё рашэнне да часу падпісання новага пагаднення з Беларуссю, паведаміў пасол Рэчы Паспалітай у Беларусі Тадэуш Паўляк, які перапрасіў тыя асобы, якія з прычыны памылкі польскага боку прымушаны былі стаяць на марозе ў шматкіламетровай чарзе.

Віталь Луба

Гімназісты ў святым кутку

Вяртанне ў мінулае

Аляксей Мароз

Арганізаванне Куцці ў Чыжоўскай гімназіі стала традыцыяй. Ужо тры гады падрад бацькі гімназістаў з першага класа з дапамогай вучняў і настаўнікаў рыхтавалі посныя стравы і ў апошні дзень вучобы перад святамі Раства Хрыстовага ладзілі ў школе сустрэчу. Сёлетняе спатканне адбылося 3 студзеня і адзначалася глыбокімі сувязямі з мінулым. Сярод запрошаных гасцей на вячэру прыбылі войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, гмінны сакратар Марыя Ляшкевіч, старшыня Гміннай рады Валянціна Якімюк і візітатар школ, у якіх вядзецца навучанне моў нацыянальных меншасцей, Іаланта Точка. Побач гасцей, за багата застаўленым поснымі стравамі сталом, селі дырэктар Комплексу школ у Чыжах Міраслаў Пяткевіч, праваслаўныя святары Чыжоўскага прыхода айцец Іаан Раманчук і айцец Марк Якімюк, настаўнікі і бацькі. За аддзельнымі сталамі сядзелі гімназісты з настаўнікамі беларускай мовы.

Куцця распачалася ад сцэнкі падрыхтоўкі да вячэры. Галоўным героем была настаўніца беларускай мовы Вера Фларчук, якая разам з вучнямі каля стройнай ёлкі рыхтавала мак для куцці. Гэтае выступленне і ўсе іншыя, у якіх побач вучняў удала выступалі настаўніцы беларускай мовы Анна Лаеўская і Валянціна Андрасюк, спалучала ідэя паказання старых абрадаў. Жыхары вёсак верылі, што знакі заўважаныя ў прыродзе і паводзіны людзей перад святамі Раства Хрыстовага будуць мець уплыў на іх жыццё ў новым годзе. Тое, што сёння паўсюдна лічаць „забабонамі", у мінулым успрымалася са страхам. Гімназісты і іх настаўнікі звярнулі ўвагу на дэталі, якія былі важнымі ў мінулым. Людзі не лізалі лыжку, каб муж не быў лысы, пакідалі ў місцы клубок з ніткамі, каб быў ураджай капусты, вязалі лыжкі, каб авечкі летам не разбягаліся і ножкі ад стала, каб авечкі не пераскочылі агароджу. Выступаючыя напомнілі, што ў мінулым людзі варажылі з сена, што ляжала пад настольным абрусам і ў апошні дзень перад святамі нічога не пазычалі, каб пазней з хаты не знікалі прадукты.

У час сустрэчы вучні паінфармавалі аб святкаванні Куцці ў краінах, дзе ў большасці жывуць неправаслаўныя вернікі. У многіх краінах у гэты дзень на сталах паяўляюцца мясныя вырабы. У Вялікабрытаніі, ЗША і Мексіцы прыносяць на сталы печаныя індыкі, у Даніі — печаную качку, а ў Бельгіі найахвотней ходзяць у рэстараны, заказваючы мясныя вырабы.

За аддзельнымі сталамі сядзелі дзед з сынамі, унукамі і бабуля з нявесткамі, якія рыхтавалі харчаванне на дзедаў стол. Яны прынеслі снапок збожжа і паставілі сталы побач іконы. Куцця ў школе распачалася ад праваслаўнай малітвы. Паколькі сярод сабраных былі вернікі рымакаталіцкага веравызнання, на сталах побач просвіраў былі аплаткі. Усе з'елі грыбны боршч і даведаліся, што грыбы з'яўляюцца сімвалам жыцця. Пасля сабраныя елі блінчыкі з грыбамі, рыбныя стравы, марынаваныя селядцы і грыбы, некалькі разрадаў салатаў, а ў прыкуску клёцкі з макам, свойскі хлеб і шчолак з груш. Напіткам, што папоўніў посныя стравы быў мёд, які сабраныя пілі, так як у мінулым, з аднаго кілішка. У час вячэры моладзь, настаўнікі і госці спявалі калядкі — беларускія, рускія і польскія. Жанчыны з калектыву „Незабудкі", якія наведалі школу, таксама заспявалі

[працяг ☞ 2]

Каб слова целам станавілася ☞ 3

Навагодняя сесія Падляшскага сейміка завяршылася асабліва. Віншавалі сябе епіскапы каталіцкіх дыяцэзій распаложаных на тэрыторыі ваяводства, праваслаўны епіскап Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакаў ды самаўрадавыя і адміністрацыйныя ўлады рэгіёна, якія выводзяцца з СЛД.

Канец Мікалаеўскай эпохі... ☞ 3

„У Мілейчычах прыйшлі да ўлады людзі, якія не любяць Мікалаяў", — тлумачыць свой пройгрыш на выбарах Мікалай Салышка. Сапраўды так склалася, што Мілейчычамі звыш 30-ці гадоў кіравалі Мікалаі. Апрача ўспомненых Салышкі і Блашчука: Мікалай Бартнічук. Ён найдаўжэй, спачатку як начальнік гміны, пазней як войт.

Зіма і беластоцкая ўлада ☞ 4

Аднак, зімка ў зімку, правіцовая беластоцкая ўлада на ніводную такую ідэю не натрапіла, засланяючыся законам і іншымі г.зв. аб'ектыўнымі прычынамі, даючы гэтым самым зарабляць зіма ў зіму няспраўным суполкам рознай масці, найчасцей, дарэчы, гмінным, значыць, сваім.

Нясвіжскі замак ☞ 4

Беларусам Беласточчыны лягчэй было пабачыць замак французскіх каралёў у Версалі, чым Радзівілаў у недалёкім мястэчку на Беларусі. Нясвіжскі замак з'яўляецца сімвалам эпохі феадалізму, які апрача прыгоннага права нёс з сабой і своеасаблівую элітарную культуру, якой стваральнікамі былі таксама прыгонныя сяляне.

Чэрвень у жніўні ☞ 5

Пра „Шлях смерці" грамадства даведалася ў пачатку 90-ых гадоў, разам з Курапатамі. Пра Чэрвень заявіла свету ацалелая грамадзянка Польшчы, Іаанна Янушчык. Першы крыж паставіў Зянон Пазьняк у 1991 годзе, з таго часу ладзіцца тут міжнацыянальнае шэсце „Ігуменскі шлях". Кожны год прыязджаюць літоўцы, палякі і разам з арганізацыяй „Ігуменскі шлях" ушаноўваюць памяць забітых.

Маляваў для храмаў ☞ 9

Шмат рэлігійных сюжэтаў напісаў я. Звыш дзесятка абразоў узяў ксёндз Андрукевіч у капліцу ў Кярснове. І для царквы маляваў абразы: „Пакроў", „Хрыстос блаславляе дзяцей". Калі адбудавалі царкву ў Новым Двары і прывезлі захаваныя ў Ячне абразы, я аднаўляў іх.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Навагодні сюрпрыз

Нечаканай падзеяй завяршыўся ў рэшце рэшт беларускі знешнепалітычны год. У перадапошні дзень снежня Беларусь і Арганізацыя па бяспецы і супрацоўнітве ў Еўропе дамовіліся аб аднаўленні працы місіі гэтай арганізацыі ў Мінску.

Падзея больш за ўсё нечаканая тым, што мала хто верыў у якую-небудзь магчымасць увогуле знаходжання паразумення паміж абодвума бакамі. Больш таго, прэтэнзіі да афіцыйных беларускіх улад з боку заходніх дэмакратый на працягу 2002 года толькі павялічваліся. Калі на якімсьці пасяджэнні ці то Савета Еўропы, ці то Парламенцкай асамблеі АБСЕ, ці то НАТО і закраналася беларуская тэматыка, то толькі ў адмоўным плане. Кіраўніцтва Беларусі, што называецца „атрымлівала на арэхі" ад кожнай больш-менш значнай еўрапейскай арганізацыі за пагаршэнне сітуацыі з правамі чалавека, свабодай слова ды ўвогуле за парушэнне тых дамоўленасцей, да якіх афіцыйныя беларускія ўлады мелі самае напасрэднае дачыненне. Асабліва гэта тычылася спрыяння ў рабоце Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Беларусі. Як вядома, цягам мінулага года гэтая група фактычна спыніла не толькі сваё функцыянаванне, але і існаванне, бо дзякуючы беларускім уладам дыпламатычнай акрэдытацыі пазбавіліся ўсе замежныя яе супрацоўнікі з-за непрацягнення віз. Вынікам такіх дзеянняў стала спачатку забарона на з'яўленне на Пражскім саміце НАТО беларускага прэзідэнта, а потым і забарона на ўезд у 14 краін Еўрасаюза, Нарвегію і ЗША васьмярым найвышэйшым беларускім чыноўнікам. Усе такія падзеі адбыліся на працягу восені і таму нічога не ўказвала на магчымую хуткую развязку і без таго моцна зацягнутага вузла дачыненняў Беларусі з вышэйзгаданымі арганізацыямі і краінамі.

Беларускае кіраўніцтва ў сваю чаргу не жадала прысутнасці ў дзяржаве тых, каго лічыла звычайнымі шпіёнамі і дэстабілізатарамі ўнутрыпалітычнай абстаноўкі. Наўрад ці гэта сапраўды адпавядала рэчаіснасці, але фактаў цесных стасункаў апазіцыі з КНГ АБСЕ, чым тых жа стасункаў апошняй з уладамі было насамрэч больш. Таму калі прэзідэнт Лукашэнка раптам пасля сустрэчы з Пуціным заявіў аб гатоўнасці выдаць візы хоць сотні прадстаўнікам АБСЕ, узнікла неабходнасць па магчымасці ўсекчы тыя функцыі і паўнамоцтвы, што мелі міжнародныя прадстаўнікі раней.

Напэўна з меркавання аб мэтазгоднасці прысутнасці хоць якой місіі АБСЕ чым ніякай падышлі да галасавання сябры Сталай Рады гэтай арганізацыі ў перадапошні дзень мінулага года. Праўда, яшчэ гавораць аб неабходнасці амаль у той жа час прыняцця бюджэту АБСЕ на 2003 год, а гэта значыць выдаткаў на дзейнасць тых ці іншых структур. І гэтыя структуры павінны альбо існаваць, альбо не. Так ці інакш, але рашэнне аб адкрыцці ў Мінску офіса АБСЕ (менавіта так цяпер будзе называцца місія) было прынятае ўсімі 55-ю сябрамі Рады аднагалосна. „За" прагаласавалі нават ЗША, якія заўсёды выступалі як апантаныя праціўнікі лукашэнкаўскага рэжыму. Здзіўляцца такім паводзінам прымушае змена мандата місіі. Цяпер яна будзе толькі дапамагаць беларускім уладам у пабудове дэмакратычных інстытутаў, забеспячэнні вяршэнства законаў і арганізацыі кантактаў з грамадзянскай супольнасцю. Гэта першая яе задача. Другая — дапамагаць уладам ажыццяўляць эканамічную і экалагічную дзейнасць. І трэцяя — назіраць за выкананнем дзвюх першых. Супрацоўнікі офіса не будуць мець дыпламатычнага статуса і мандат місіі трэба будзе штогод працягваць альбо не працягваць.

Беларускія кіруючыя колы віталі такі вынік перамоў і галасавання. Беларуская апазіцыя пакуль адназначна не выказалася, але з яе боку усё больш чутны словы расчаравання і „еўрапейскай здрады". У той жа час амерыканская адміністрацыя выказвае задавальненне рашэннем улад Беларусі аднавіць працу прадстаўніцтва АБСЕ і мяркуе ў недалёкім будучым правесці кансультацыі з урадамі еўрапейскіх дзяржаў аб адмене абмежаванняў на ўезд у свае краіны высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў. У Еўрасаюзе лічаць, што гэтая падзея мае палепшыць стасункі з Беларуссю і плануюць цягам студзеня абмеркаваць ці дасягнула беларускае кіраўніцтва прагрэс у дачыненнях з АБСЕ, апазіцыяй, у правах і свабодах чалавека.

Падаецца вельмі дзіўным, што такія радыкальныя перамены ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі могуць адбыцца на працягу некалькіх тыдняў. Але жыццё, як мы бачым, перапоўнена сюрпрызамі. І калі адзін з іх ужо адбыўся — у магчымасць вышэйзгаданых перамен да лепшага за такі малы прамежак часу ўсур'ёз паверылі неаднаразова падманутыя беларускімі ўладамі заходнія дыпламаты, то чаму не можа адбыцца другі — у перамены да лепшага паверацъ у Беларусі?

Уладзімір Лапцэвіч

Фота Аляксея Мароза

Вера Фларчук з вучнямі каля стройнай ёлкі рыхтуюць мак для куцці

Вяртанне ў мінулае

[1 ☞ працяг]

некалькі калядак і селі за стол. Вера Фларчук напамінала, што трэба прынамсі спрабаваць усе стравы, але заахвочваць не было трэба. Усе стравы былі надта смачныя. Апошняй стравай была куцця з макам, мёдам і іншымі салодкімі спецыямі. Спачатку дзед абышоў сталы, так як у мінулым абыходзілі хату, пасля нявестка разносіла куцю для гасцей і вучняў. Удзельнікі спаткання спажывалі яе ў цішыні і з вялікай пашанай.

— Думаю, што наша Куцця з'яўляецца пачаткам для хатніх сустрэч і атмасфера нашага спаткання перанясецца ў вашыя хаты. Арганізаванне Куцці ўпісалася ўжо ў традыцыю школы і будзе яна ладзіцца ў наступных гадах, — заявіў дырэктар Міраслаў Пяткевіч.

Вяртанне ў мінулае зрабіла вялікае ўражанне на гімназістах, якія першы раз сабраліся на такую вялікую Куццю, прадстаўніках гміннай улады і візітатар.

— Чалавечую годнасць і сваю тоеснасць нельга купіць, але трэба яе мець. Ёсць яна сярод вас, — сказала візітатар Іаланта Точка, развітваючыся з гаспадарамі мерапрыемства.

Войт Юрый Васілюк павіншаваў сабраных з Калядамі і ўручыў гімназістам падарункі. Папоўнілі іх школьныя ласункі з-пад ёлкі.

Аляксей Мароз

З мяжы

Роўна ў навагоднюю поўнач легкавыя аўтамашыны і аўтобусы рушылі на дарожны пагранпераход у Кузніцы-Беластоцкай. Мытны і пашпартны кантроль адбываецца пакуль толькі з беларускага боку.

Інвестар перабудовы і мадэрнізацыі пагранпераходу ў Кузніцы — Падляшская ваяводская ўправа. Выдаткаваных мае быць каля 250 мільёнаў злотых (выдалі ўжо 100 млн зл.). Мае яна завяршыцца ў 2004 годзе. Будзе гэта найбольшы пагранпераход на ўсходняй мяжы Польшчы. Удалося рэалізаваць інвестыцыі ў тэрміне, хоць фірма Warbud SA з Варшавы толькі два з паловай месяца таму ўвайшла на пляцоўку пагранпераходу. Пабудавалі шашу, якая спалучае Польшчу і Беларусь і будынак Памежнай стражы. У кастрычніку пагранпераход мае быць адкрыты таксама для грузавых машын.

На тэрыторыі пагранпераходу ў Кузніцы-Беластоцкай (18 гектараў — да рамонту было толькі два) мае быць сорак будынкаў для мытных і памежных служб (каля 27 тыс. м^2), усе згодныя патрабаванням Еўрасаюза, сярод гэтага — санітарным ды ветэрынарным. На апошняй тэрыторыі змогуць дзейнічаць паслугова-гандлёвыя фірмы — банкі, страховачныя кампаніі, абмен валют, мытныя агенцтвы, прадстаўніцтвы аўтапрадпрыемстваў, гастранамічныя (але рэстаранаў і гасцініц не будзе на самім пагранпераходзе). Зможа перапраўляцца ў будучыні ў суткі цераз гэты пагранпераход 8 тыс. легкавушак і паўтары тысячы грузавікоў. Для прыкладу, сёння ў Баброўніках абслугоўваецца ў суткі толькі паўтары тысячы машын.

Большасць фінансавых сродкаў на перабудову Кузніцы паходзіць з дапамогавых фондаў Еўрасаюза. (лук)

Спадару **Сакрату Яновічу**
(супрацоўніку нашай рэдакцыі ў мінулым)
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора
— **смерці Маці** —
выказвае калектыў „Нівы".

Паэт Славамір Адамовіч папрасіў палітычнага прытулку ў Нарвегіі

Гэты крок Славамір Адамовіч патлумачыў Радыё Свабода „немагчымасцю далей жыць і працаваць у краіне, дзе не паважаецца свабода і дэмакратыя". Цяпер Адамовіч знаходзіцца ў адным з лагераў уцекачоў на поўначы Нарвегіі. Вырашэння свайго лёсу ён будзе чакаць яшчэ больш за паўгода.

Славамір Адамовіч стаў шырока вядомы пасля напісання верша „Убей президента". У 1996 годзе за гэты верш ён быў арыштаваны КДБ і правёў за кратамі турмы на вуліцы Валадарскага ў Мінску 10 месяцаў.

Славамір Адамовіч адзначыўся таксама актыўнай палітычнай дзейнасцю. Падчас вулічнай акцыі 1998 года Адамовіч публічна зашыў сабе рот, пратэстуючы супраць наступу дзяржавы на свабоду слова ў Беларусі.

Навіны Хартыі '97, 8.01.2003 г.

„Уцякач" з Польшчы

Незвычайнага парушальніка граніцы затрымалі беларускія пагранічнікі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-цэнтры Дзяржкамітэта пагранічных войскаў, у перадднавагоднюю ноч вартавыя дзяржаўных рубяжоў спынілі грамадзяніна Польшчы без дакументаў. У ходзе разбору ён паведаміў, што парушыў граніцу з мэтай атрымаць палітычны прытулак у Беларусі. Гэта рашэнне ён растлумачыў тым, што на радзіме яго праследуюць па рэлігійных матывах. „Уцякач" сустрэўся з польскім консулам у Гродне. Далейшы лёс затрыманага польскага грамадзяніна вызначаць спецыялісты па міграцыі.

Ігар Хадасевіч, БЕЛТА
„Звязда", № 3, 4.01.2003 г.

Каб слова целам станавілася

Навагодняя сесія Падляшскага сейміка завяршылася асабліва. Віншавалі сябе епіскапы каталіцкіх дыяцэзій распаложаных на тэрыторыі ваяводства, праваслаўны епіскап Беластоцка-Гданьскай епархіі Іакаў ды самаўрадавыя і адміністрацыйныя ўлады рэгіёна, якія выводзяцца з СЛД.

Пакуль дайшло да калядных і навагодніх ветлівасцей, радныя тры гадзіны прысвяцілі, так сказаць, на працэдуральна-фармальныя дыскусіі, а нават час ад часу штурхачы. Пачалося ад выступлення Зянона Дзедзіца з Лігі польскіх сем'яў, які меў жаль да пратаканалісткі і прэзідыума сейміка з-за несумленнага зафіксоўвання ягоных выступленняў. Радны не выглядаў перакананым нават статутным запісам, што ў пратаколе пасяджэння змяшчаюцца толькі рэзюме думак выказаных у ходзе сесіі. Радныя ПСЛ Мечыслаў Багінскі і Адам Чэслаў Дабронскі кпінкуючы выказалі сваё задавальненне, што радны Дзедзіц агорнуты клопатам за будучых даследчыкаў гісторыі сеймікавай дзейнасці.

— Пратакол, гэта, аднак, не стэнаграма, — патлумачыў радны Дабронскі (віцэ-старшыня сейміка).

Канчаткова дакладны запіс выступлення раднага Дзедзіца быў далучаны да пратакола з папярэдняга пасяджэння.

У сваю чаргу радны Цэзары Цеслюкоўскі (Грамадзянская платформа) заклікаў зацікавіць урад, каб грашыма з Еўрасаюза (з фондаў, якія трэба выкарыстаць да сакавіка) на мадэрнізацыю і іншыя патрэбы звязаныя з польска-літоўскай мяжой распараджаўся польскі бок, як гэта адбываецца з мяжой з Беларуссю і Украінай. Прапанаваў таксама намякнуць міністру эканомікі, каб урад націскаў на прадстаўнікоў Еўрасаюза ў справе магчымасці пабольшання ў нашым рэгіёне сёлетняй прадукцыі малака, у сувязі з мінулагодняй засухай, а затым меншым вырабам малака ды прадказванымі меншымі да яго еўрасаюзнымі даплатамі.

Радныя, аднак, пераймаліся таксама сваімі праблемамі. Мечыслаў Багінскі, для прыкладу, шмат месца прысвяціў праблеме незнаёмасці месцапалажэння паркінгаў, што быццам сур'ёзна ўскладняе жыццё радным глыбінкі. Больш канкрэтнага памеру набраў пункт, па ходзе разглядання якога раднага ад СЛД Аляксандра Сяліцкага, які зрокся мандату, заступіў галасамі рашучай большасці Ежы Панасюк (таксама СЛД).

Апошняе ў старым годзе пасяджэнне здамінавала справа згоды радных на разарванне дамовы на працу са старшынёй „ваяводскага сейма" Збігневам Кшывіцкім. З такой просьбай (і згодна з законам) выступіў ягоны работадавец, суполка *Ad Novum*, выдавец „Trybuny", якое журналістам Кшывіцкі працуе ўжо шмат гадоў. Самаўрадаўцы доўгі час не маглі вырашыць, як мае выглядаць змест прапановы, над якой маюць галасаваць. Канчаткова ўсе радныя былі за тым, каб просьбу адкінуць, значыць, адмовіць даць згоду на разарванне дамовы. Большасць тлумачыла гэта неабходнасцю самаўрадавай салідарнасці, хоць З. Кшывіцкі, здаецца, больш дыпламатычна, сам выступіў даць згоду на прапанову выдаўца „Trybuny" і ў пазнейшым галасаванні стрымаўся ад голасу:

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Епіскап Іакаў у размове з маршалкам Янушам Кшыжэўскім

— У мяне такі звычай: не ўваходзіць туды, куды мяне не просяць, і выходзіць адтуль, дзе мяне не хочуць.

Кшывіцкага абараняла нават апазіцыя (Права і Справядлівасць, Грамадзянская платформа і Ліга польскіх сем'яў), хоць яе намеры былі іншыя, чым кіруючай кааліцыі (СЛД-ПСЛ-Самаабарона):

— Я за абарону раднага. Сеймік нельга ўцягваць у палітычныя разборкі паміж работадаўцам а работнікам, — пераконваў Кшыштаф Путра (PiS).

З яго выказвання, аднак, ясна вынікала, што абарона Кшывіцкага мае выразна расстроіць планы выдаўцам левай „Trybuny" і яе новую палітычную і персанальную лінію.

Спакайней, хоць без аплатка і просвіры, было ў час навагодня-святочнага спаткання з іерархамі абедзвюх Цэркваў. Архібіскуп Войцех Земба, каталіцкі ардынарый Беластоцкай архідыяцэзіі, так звярнуўся да кіруючай лявіцы:

— Верым, што на гэтай тэрыторыі зможам знайсці супольную мову.

А епіскап Іакаў заўважыў:

— Жадаю, каб 2003 год быў лепшы. Людзі гэтага чакаюць. Мусім узяцца за супольныя дзеянні, каб лепш жылося.

Прысутны на сустрэчы падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі (СЛД) заўважыў, што, як і з боку касцельнага і царкоўнага, так і з цяперашняга ўраду, ёсць шмат волі супрацоўніцтва і стварання цёплага клімату.

Пры ёлцы ўсе прысутныя адспявалі калядку. У калідорах Маршалкоўскай управы гучалі словы каляднай песні напісанай стагоддзі таму ў Беластоку: „A słowo ciałem się stało..."

Мацей Халадоўскі

Канец Мікалаеўскай эпохі або Доктар войтам

— Пан доктар, гэта вядомая і шанаваная ў наваколлі асоба, але думаю, што цяпер адмовіцца ад выконвання сваёй прафесіі і будзе поўнасцю войтам на карысць гміне. З падвойнымі абавязкамі немагчыма справіцца, — Мікалай Блашчук быў войтам Мілейчыцкай гміны ў 1994-98 гадах, таму ведае што кажа.

Яго наследнік, Мікалай Салышка, паспрабаваў быў спалучыць кіраванне гмінай з прафесійнай працай у Бельску. Выклікала гэта недаўменне жыхароў і шум у медыях. Салышка ўканцы стаў поўнаштатным войтам, але і цяпер не прызнаецца, што яго першапачатковыя планы былі нерэальныя:

— Спачатку я ўзмоцніў фінансы Гміннай управы, адно тады стаў там працаваць на поўным штаце.

Мабыць, пасля сёлетніх самаўрадавых выбараў і пашкадаваў гэтага рашэння, бо прайграў войтава крэсла Ананію Савіцкаму. Сваю паразу лічыць несправядлівай, бо дзякуючы ашчаднаму гаспадараванню рамантаваў гмінныя гравійкі, выліў 3,5 кіламетра асфальту ў Мілейчычах, а ў Сабятыне быў пракладзены водаправод.

— У Мілейчычах прыйшлі да ўлады людзі, якія не любяць Мікалаяў, — тлумачыць свой пройгрыш на выбарах Мікалай Салышка.

Сапраўды так склалася, што Мілейчычамі звыш 30-ці гадоў кіравалі Мікалаі. Апрача вышэй успомненых: Мікалай Бартнічук. Ён найдаўжэй, спачатку як начальнік гміны, пазней як войт. Аднак цяжка абараніць намёк Салышкі на тое, што ў змаганні за Мілейчычы праваслаўных перамаглі людзі павязаныя з Каталіцкім касцёлам і „Салідарнасцю" (што б апошняе слова цяпер не абазначала). Новы войт, Ананій Савіцкі — чалавек мясцовы, праваслаўны. Кандыдаваў са спіска Саюза левых дэмакратаў.

— Я рашыўся на гэта, каб пакончыць у Гміннай управе з некампетэнтнасцю, дрэннай атмасферай між людзьмі, — гаворыць Ананій Савіцкі, кіраўнік мілейчыцкай амбулаторыі, адзіны лекар у гміне.

Хаця яго выбарчая праграма не рознілася ад тае, з якою выступалі пяць ягоных канкурэнтаў — змаганне за датацыі для гміны, новыя месцы працы, рамонт дарог, пракладка водаправодаў — аднак то яму даверыліся выбаршчыкі. Старэйшая жанчына на галоўным скрыжаванні Мілейчыч тлумачыць яго поспех наступным чынам:

— Добры лекар, добры чалавек, ніколі не адмовіў у дапамозе. А як будзе намі правіць, то хто яго ведае.

Ці доктар Ананій Савіцкі мае намер надалей лячыць людзей?

— На выбарчай лістоўцы я пісаў: „Не пакіну маіх пацыентаў". Калі б я адмовіўся ад лекарскай практыкі, ашукаў бы не толькі выбаршчыкаў, але і пацыентаў. Я працы не цураюся. Магу рабіць па 10-12 гадзін у суткі, калі будзе такая патрэба. Гмінная ўправа амаль па-суседску з амбулаторыяй. Чалавек з хваробай можа прыйсці ва ўправу і наадварот, хадайнік — у амбулаторыю. Былі ўжо такія выпадкі.

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Ці доктар Ананій Савіцкі вылечыць Мілейчыцкую гміну?

Мілейчыцкая гміна невялікая — усяго 2 тысячы 300 жыхароў. Але патрэб тут намнога больш, чым магчымасцей іх ажыццяўлення.

— Гэта тыповая ўсходняя сцяна, адкуль уцякае моладзь, бо няма тут ніякіх перспектываў, — гаворыць Мікалай Блашчук. — Але і ў параўнанні з найбліжэйшымі суседзямі жывем горш, бо маем вялікія запазненні. Надагнаць упушчаны час можа толькі асоба энергічная, якая возьме сабе добрага дарадчыка, спрактыкаванага юрыста, які сумее прыцягнуць у гміну інвестыцыі і грошы з фондаў Еўрасаюза.

— Я разумею, што не ўсё магу зрабіць сам, — кажа Ананій Савіцкі. — Можа папрашу дапамогі ў лекара з суседняга Нурца?

Першыя планы новага войта звязаны з аховай здароўя. Хоча ён пераўтварыць гмінную амбулаторыю ў непубліччную.

— Хачу зазначыць, што пацыенты гэтай змены не заўважаць, — заяўляе на пачатку размовы пра планаваную рэформу, — лячэнне будзе як і да гэтай пары, бясплатнае.

І лячыць будзе той самы доктар, Ананій Савіцкі. Хаця ад лютага ідзе на пенсію.

Трэба пажадаць яму моцнага здароўя.

Мікола Ваўранюк

Галоўны ўваход у Нясвіжскі замак

Нясвіжскі замак

Нядаўна прагучала сумная вестка, што згарэла частка Нясвіжскага замка. За кошт вялікіх сродкаў ад некалькіх гадоў праводзіцца рамонт гэтага помніка архітэктуры і гісторыі Беларусі. Гэта адзін з нешматлікіх замкаў, які ператрываў камуністычнае варварства, калі знішчалася ўсё, што магло вяртаць гістарычную памяць. У 1945 г. у замку была змешчана санаторыя, што выклікала патрэбу правядзення неабходных рамонтаў. У Беларусі часта можна пачуць, што адрамантаваны замак мае стаць рэзідэнцыяй Аляксандра Лукашэнкі. Савецкія чыноўнікі заўсёды мелі такія імкненні, таму што камунізм мае шмат супольнага з феадалізмам. Замак аднак як помнік культурнай спадчыны Беларусі раней ці пазней стане агульнанацыянальнай уласнасцю, як кракаўскі Вавель у палякаў.

Беларусам Беласточчыны лягчэй было пабачыць замак французскіх каралёў у Версалі, чым Радзівілаў у недалёкім мястэчку ў Беларусі. Нясвіжскі замак, як і версальскі, з'яўляецца сімвалам эпохі феадалізму, які апрача прыгоннага права нёс з сабой і своеасаблівую элітарную культуру. Гісторыя Нясвіжа паказвае, што яе стваральнікамі былі таксама прыгонныя сяляне.

Вялікая перабудова першага драўлянага замка ў Нясвіжы пачалася Мікалаем Радзівілам Сіроткай у 1583 г. (фактычна трывае яна па сённяшні дзень). Мураваны замак пабудаваны на пачатку XVII стагоддзя размяшчаўся на плане чатырохвугольніка памерамі 170 х 120 метраў. Замак акружаў высокі на 20 метраў зямельны вал абкладзены каменем. Вакол вала пабудаваны быў штучны вадаём ад ракі Ушы. Сам замак здаваўся тагачасным будаўнікам быць недаступным для ворага. Будаваўся ён, дарэчы, дзеля мілітарнага прызначэння. Мінула сто гадоў і шведская артылерыя даказала, што такія замкі не маюць ніякага значэння. Падчас Паўночнай вайны, у 1706 г. гарматы на працягу двух дзён абярнулі замак у руіну.

Адбудова замка пачалася ў 1726 г., але Радзівілы вырашылі стварыць у Нясвіжы сваю рэзідэнцыю па ўзоры італьянскіх манархаў. Будаваўся не звычайны замак, але трохпавярховы палац з двума корпусамі паводле версальскага ўзору. На ніжнім паверсе замка знаходзіліся памяшканні для службы і лазні, вышэй — апартаменты Радзівілаў. У дапаможных корпусах, якія пабудаваны былі абапал брамы, знаходзіліся пакоі гасцей, капліцы, кухні, майстэрні і памяшканні для службы, якая непасрэдна не абслугоўвала гаспадароў. Замак абгараваўся кафлянымі і фаянсавымі печамі. Разам у замку знаходзілася каля трохсот гасцінных пакояў і дванаццаць вялікіх парадных залаў. Адна называлася бібліятэчнай, у якой Радзівілы сабралі больш за дваццаць тысяч рукапісных і друкаваных кніжак амаль на ўсіх еўрапейскіх мовах. Другая зала называлася партрэтнай. На яе сценах вісела больш за 900 партрэтаў прадстаўнікоў Радзівілаўскай сям'і. Вялікая частка гэтых партрэтаў выканана была прыгоннымі сялянамі. У мармуровай зале дамінаваў чорны мармур, у залатой — пазалочана была вялікая частка сцен і столі. Паркет ва ўсіх залах быў выкананы са ста гатункаў дрэва, што дазваляла на атрыманне разнародных мазаік і дэкаратыўных арнаментаў. Вялікай галерэяй былі сцены вакол сходкаў і калідоры. Пазалочаныя медныя балюстрады ў галоўным корпусе былі асаблівасцю не толькі ў межах Рэчы Паспалітай, але і Еўропы.

Замкавыя паркі займалі плошчу больш за тысячу гектараў. Радзівілаўскія паркі гэта запланаваная сістэма дарог, сцежак, расліннасці, штучных азёр і каналаў. На паркавых водных шляхах плавала заўсёды некалькі невялікіх суднаў. Паркі арганізаваліся паводле французскага, англійскага, італьянскага, а ў XIX стагоддзі таксама японскага ўзораў. Пару соцень людзей, у тым ліку знакамітых батанікаў, пастаянна абслугоўвала паркавую інфраструктуру.

Асаблівае месца ў гісторыі Радзівілаўскай рэзідэнцыі займае опера і тэатр. Тэатр быў заснаваны Францішкай Радзівіл у 1746 г. Княгіня была аўтаркай некалькіх камедый і драм. Акцёрамі гэтага спачатку аматарскага тэатра былі члены сям'і Радзівілаў, мясцовая шляхта і прыгонныя сяляне. Першыя спектаклі ставіліся ў замку, у партрэтнай зале. Паралельна з тэатральным калектывам стваралася капэла. Спачатку дамінавалі музыкі італьянскага і нямецкага паходжання, але пасля заступілі іх выпускнікі Нясвіжскай музычнай школы, сярод якіх было шмат прыгонных сялян. У васьмідзесятыя гады пры замку ўзнікла таксама балетная школа. Сярод танцораў на падмостках тэатра сталі дамінаваць мясцовыя сяляне. У шасцідзесятыя гады ў парку быў пабудаваны вялікі амфітэатр, дзе магло адначасова выступаць каля двухсот выканаўцаў — акцёраў, танцораў, музыкаў, спевакоў. У Нясвіжы выконваліся творы найбольш вядомых драматургаў і кампазітараў. У амфітэатры былі месцы для тысячы гледачоў, білетаў ніхто не прадаваў, таму ўсе яны выкарыстоўваліся. Гледачамі былі не толькі магнаты, але таксама мясцовая шляхта і мяшчане.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі пры канцы XVIII стагоддзя Радзівілы моцна абмежавалі культуратворчую дзейнасць. Тэатр спыніў сваё існаванне, бібліятэка была вывезена царскімі чыноўнікамі ў Пецярбург. Замак і творы мастацтва ў ім ператрывалі ў добрым стане да 1945 г. Рамонт замка з'яўляецца адной з найбольш патрэбных інвестыцый у Беларусі. Праблема толькі ў тым, што пралетарыят, які там працуе, можа нанесці большыя шкоды чым бальшавіцкая рэвалюцыя.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Зіма і беластоцкая ўлада

Ніколі я не мог чамусьці зразумець, чаму чарговыя беластоцкія ўлады не могуць справіцца з зімою: слізготаю, растопамі, гурбамі снегу і г.д. Не гавару ўжо пра сітуацыю на беластоцкай вёсцы, дзе, бывае, цэлымі тыднямі не праб'ешся праз завалы снегу і адзін Бог ведае, колькі асоб у апошні час магло памерці з-за немагчымасці даезду скорай дапамогі, калі хто-небудзь выклікаў яе да цяжка хворага, бо нейкім цудам удалося яму дабрацца да сучаснага вынаходства званага тэлефонам.

Траціўшы апошнюю пару ботаў, прамакаючых, дарэчы, думаю так сабе пра зімовыя дзеянні беластоцкіх улад. Тых улад з ратушы і тых, якія кіруюць жыллёвымі кааператывамі, пасамі тратуараў ля прыватных падворкаў (дамоў, крамаў). Так у сапраўднасці гэтыя зімовыя дзеянні абмяжоўваюцца да пасыпання час ад часу і дзенідзе тратуараў пяском альбо соллю. Сёлета ўвогуле рэдкасць убачыць даведзеныя да г.зв. чорнага паверхні для пешаходаў і згортванне разбітага ільду, а пры нагодзе і снегу на абочыны. Трагічна бывае ў дні, калі пачынае таяць снег. Тады маршыруеш у воднаснежнай бразе, пад якою злавесна скрываецца слой ільду. І хоць беластоцкія ўлады так падкрэсліваюць, як ім жа ж вельмі залежыць на бяспецы жыхароў, то ніякіх практычных дзеянняў дзеля супольнага апрацавання (напрыклад, з кааператывамі) магчымасці забеспячэння элементарнага пачуцця бяспекі не робяць. Падазраваю, што ў Беластоку лік шкод на здароўі ў выніку разбою і іншых такога тыпу злачынстваў непараўнальна меншы, чым вынікі зімовых тратуарных занядбанняў.

Беластоцкія ўлады, ужо другі раз, дзякуючы выбару жыхароў, пад той самай прэзідэнтурай Рышарда Тура прабуюць тлумачыцца, што з вынікамі зімы штосьці там зробяць. Аднак, як ёсць і дасюль было, кожны бачыць і брыдзе ў злосці па беластоцкіх тратуарах. Прэзідэнт (прэзідэнты?) гэтай ці папярэдняй кадэнцыі падкрэслівалі, які гэта іхны клопат — беспрацоўе. А, можа, даць хоць аднаразовы шанц шмат якім канкрэтным беластоцкім беспрацоўным: няхай заробяць пры разбіванні ільду, адснежванні вуліц? А, можа, замест безвынікова сысківаць аўтобусных зайцоў за неаплачаныя мандаты-штрафы, памяняць іх кошт на „днёўку", адробленую пры снезе ды ільдзе? Можна было б дагаварыцца з калегіумамі па справах правапарушэнняў (сёння Гродзкім судом) і паліцыяй, каб таксама маглі прымяніць такі „заменнік" у адносінах да беспрацоўных і тых, хто ў цяжкай фінансавай сітуацыі? А, можа, як і з зайцамі, таксама адбіраць заплаты і за выцвярэзнік (калі ён увогуле мусіць дзейнічаць), у большай часці немагчымыя да сыскання нават Скарбовымі палатамі? Пэўна, такіх ідэй — дзесяткі.

Аднак, зімка ў зімку, правая беластоцкая ўлада на ніводную такую ідэю не натрапіла, хаваючыся за законам (бывае, што ёю самою ўстаноўленым) і іншымі г.зв. аб'ектыўнымі прычынамі, даючы гэтым самым зарабляць зіма ў зіму няспраўным суполкам рознай масці, найчасцей, дарэчы, гмінным, значыць, сваім (значыць — чыім?).

Тым часам з зайздрасцю глядзеў я ў телебачанні справаздачы з заснежанай Масквы, дзе адзін жыхар выдумаў спецыяльныя металёвыя засцерагальнікі на боты (падобныя, як на аўташыны). Выдумаў гэта адзін дзядзька, які хацеў памагчы сваёй пажылой маці, што баялася выйсці зімой нават у краму. Засцерагальнікі ідуць як свежыя булачкі. Бо ў Маскве (як і ў Мінску, і ў краінах на ўсход ад Польшчы) не ад сёння ведаюць, што калі ўлада не спраўляецца з праблемай, дык трэба з ёю справіцца самому, тым больш, калі на гэтым можна зарабіць. Мы гэта таксама ведалі ў ПНР. Пасля захапіліся дэмакратычнымі выбарамі, верачы, што тыя прадстаўнікі народа і мясцовага грамадства будуць дбаць пра нашы справы, асабліва пра найбольш дакучлівыя, як „вынікі зімы". Ну, і што? Прынамсі ў Беластоку ўсё выбіраем тых самых, якія нават са снегам ды ільдом на тратуарах не спраўляюцца! Так што, бачыце, у цане застаецца ўласная кемлівасць, от, такая, як таго масквіча ад засцерагальнікаў на боты.

Мацей Халадоўскі

Нясвіжскі замак будзе адноўлены да 2006 г.

Радзівілаўскі замак у Нясвіжы будзе адноўлены да 2006 года, — заявіў 4 студзеня 2003 г. міністр культуры Беларусі Леанід Гуляка на пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі па рэстаўрацыі замка Радзівілаў у Нясвіжы.

Паводле апошніх паведамленняў пажар, які ўспыхнуў 24 снежня мінулага года, паглынуў больш за 700 м^2 паддашшаў і трэцяга паверха замка ў яго цэнтральнай частцы. Пашкоджаны былі роспісы на сценах і столі ды паркеты XVII-XVIII стагоддзяў.

Рамонт родавай сядзібы Радзівілаў вядзецца ўжо два гады (да 2000 г. у замку працаваў санаторый для работнікаў сельскай гаспадаркі), таму ў яго памяшканнях не было каштоўнага абсталявання.

Паводле міністра Леаніда Гулякі, на рамонт спатрэбіцца 60 млрд. беларускіх рублёў, або 120 млн. злотых. На сам праект аднаўлення замка трэбы выдаць раўнацэннасць 7 млн. зл. Тым часам у гэтым годзе Міністэрства культуры на рэстаўрацыю родавай сядзібы Радзівілаў прызначыць 2 млн. зл. Міністэрства фінансаў Беларусі падтрымае рэстаўрацыю замка сумай роўнай 400 тысяч зл.

Першыя рамонтныя работы пачнуцца з пакрыцця будынка, паколькі дах найбольш пацярпеў ад пажару. На час распрацоўкі праекта металічнага пакрыцця даху замак будзе прыкрыты брызентам. Леанід Гуляка спадзяецца на замежную падтрымку. „Можа адазвуцца патомкі Радзівілаў. Будзем вельмі ўдзячны ім", — сказаў міністр.

Прычынай пажару была няўвага двух рабочых, якія адкрытым агнём размарожвалі ўстаноўку цэнтральнага ацяплення. Пагражае ім за гэта да трох гадоў турэмнага зняволення.

Паводле ПАП

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Мемарыяльны крыж ахвярам чэрвеня 1941 г.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Каплічкі на „Шляху смерці”

Чэрвень у жніўні (3)

Месца масавага расстрэлу ў лесе каля Чэрвеня, вядомае як „Дарога смерці”, ушанавалі на свой спосаб, нават, зладзеі. З прыдарожнай каплічкі ўкралі ікону, а на яе месца павесілі такую ж самую, папяровую!

* * *

— *У навакольным лесе ляжаць сотні грамадзян Беларусі, Літвы, Польшчы, расстраляныя бальшавікамі* — чытаем на ледзь прыкметнай табліцы, ля той папяровай іконы. На большую табліцу, у відавочным месцы, улады горада не пагаджаюцца. Дакладна невядома колькі ахвяр закапаных у лесе. Адміністрацыя множыць перашкоды, доследы разбіваюцца аб малаважныя дэталі. Справа ледзь зварухнецца з месца і зноў вяртаецца да пачатку. Змагарам ідзе пра асновы — зрабіць спісак ахвяр і назваць колькасць расстраляных:

— Мы должны посмотреть, — кажуць чыноўнікі на кожную інтэрвенцыю дзеячаў арганізацыі „Ігуменскі шлях” і БНФ, — мы должны посмотреть! — Не пагаджаюцца на прысутнасць грамадскіх назіральнікаў.

— Зараз ідзе змаганне за надпіс, — кажа Вольга Матусевіч. Адміністрацыя не пагаджаецца на надпіс: „Ахвярам палітычных рэпрэсій бальшавіцкага рэжыму”. Такі надпіс быў, але яго знялі і астаўся скарочаны варыянт (на беларускай, літоўскай і рускай мовах): „Ахвярам рэпрэсіі”.

* * *

Пра „Шлях смерці” грамадства даведалася ў пачатку 90-ых гадоў, разам з Курапатамі. Пра Чэрвень заявіла свету ацалелая грамадзянка Польшчы, Іаанна Янушчык. Першы крыж паставіў Зянон Пазьняк у 1991 годзе, з таго часу ладзіцца тут міжнацыянальнае шэсце „Ігуменскі шлях”. Кожны год прыязджаюць літоўцы, палякі і разам з арганізацыяй „Ігуменскі шлях” ушаноўваюць памяць забітых. Моляцца за спакой душы, успамінаюць загінуўшых. Ад імя польскага і літоўскага народаў устаноўлены мемарыяльныя крыжы і скульптуры. Ад беларусаў разьба Генадзя Матусевіча — „Смуткуючы анёл”.

Сярод ахвяр забойства ў Чэрвені найбольш інтэлігенцыі.

— Яшчэ да вайны пачалі звозіць сюды з Мінска зняволеных, у тым ліку палітычных вязняў, — расказваюць Генадзь і Вольга Матусевічы, якія дзейнічаюць у „Ігуменскім шляху”.

— Ноччу 26 і 27 чэрвеня 1941 года НКВД пачало ліквідаваць вязняў. Зняволеных выгналі на дарогу ў лес і расстралялі.

Перастрэлка ў Чэрвені, як успаміналі яе ацалелыя ахвяры, вылучалася звярынай лютасцю. Прыгналі іх на дарогу і стралялі па ўцякаючых. Гналі іх два кіламетры — да апошняга жывога. Пасля расстрэлу саветы з’ехалі, трупы забітых закопвалі немцы або валачылі ваўкі.

* * *

У чэрвені 2002 года ўжо 11 раз арганізавалі шэсце „Ігуменскім шляхам”. Як кожны раз падтрымку праявілі літоўцы і палякі. У самім горадзе пайшла чутка, што шэсце нібыта забароненае.

— Жыхары Чэрвеня зноў сталі баяцца, — кажуць нашы субяседнікі.

— У час, калі ішло шэсце, людзі сталі за брамкамі, баяліся выйсці на вуліцу. Няма чаму здзіўляцца. Штатныя кадэбісты завіхаліся з камерамі, кожную дэталь рэгістравалі на плёнку.

— Я пайшла ў райвыканкам, — кажа Вольга, — і пытаю: „Навошта вы гэта нам робіце?” А яны адказваюць без цырымоніі: — Каб ведаць, хто што сказаў і што зрабіў!

Надзея на годнае ўшанаванне месца — у міжнароднай падтрымцы. У Беларусі зараз няма адказных. Дзеля замоўчання злачынства выкарыстоўваецца нізкі ўзровень зацікаўлення мінулым. Тэрыторыя афіцыйна не знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Летам тут пасвяць кароў, збіраюць ягады. Праўда, ёсць і другія прыклады — на Дзяды заўсёды прыносяць сюды кветкі і запальваюць свечкі.

* * *

Нявысветленае пытанне — чаму саветы, перад надыходам нямецкай арміі, знішчалі сваіх вязняў?

— Няма адказу! Ёсць толькі меркаванне, — кажуць нашы суразмоўцы, — сярод зняволеных было шмат інтэлігенцыі. Бальшавікі баяліся, што яны дастануцца ў рукі немцаў.

Ніхто не ведае, як завершыцца справа ўшанавання „Дарогі смерці”. Сёння ніхто за яе не адказны.

У Чэрвені спадзяюцца на дапамогу палякаў і літоўцаў. Бо яны ўжо сталі на ногі, — кажуць, — а мы яшчэ толькі вучымся.

У чэрвеньскім лесе на мазгі налятае смутак, страх. Ён кладзецца на ўвесь горад чорным ценем.

— Хто да нас не прыедзе той наракае, што дух такі цяжкі, — кажа Генадзь Матусевіч.

Ганна Кандрацюк

Падароск і Краскі

Падароск — малая вёска ў Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці. Не вельмі яна адрозніваецца ад іншых. Гасцінныя, зычлівыя людзі, возера (якога назвы ніхто не ведаў) і асаблівасць для турыстаў — двор, у якім жыў пан Бохміц.

„Вельмі жорсткі быў, толькі павялічваў свой маёнтак і строга адносіўся да сваіх падданых”, — так пра ўладара даўняга прыгожага дварка гавораць людзі. Пан Бохміц, на думку старэйшых людзей, жыў недзе ў XVIII ст. Меў дзве дачкі і аднаго сына. Пра яго дворык не існуюць ніякія легенды, але рака Зальвянка захапляе сваім выглядам і пра мінуўшчыну дворыка можна снаваць цікавыя домыслы.

Строгі пан Бохміц месца свайго вечнага адпачынку выбраў таксама незвычайнае. Ён не пахаваны на вясковых могілках, але за вёскай, на ўзгорачку ў сваёй прыватнай грабніцы. Даўней на месцы яго пахавання раслі бярозы, вакол усё было прыгожа абложана камянямі. Цяпер асталіся толькі разваленыя камяні і сляды месца, дзе быў пахаваны пан Бохміц.

Дворык у Падароску — гэта помнік архітэктуры. Пры ім здымалі фільм „Хлеб штодзённы”. Да сённяшняга дня дворык „дарабіўся” быць канторай, а раней ён быў музычнай і сярэдняй (поўнай 10-гадовай) школай.

Непадалёк Падароска ляжыць вёска Краскі. У ёй стаіць замачак, у якім уладарыў пан Сегень. Паводле людзей, паны з сабой сябравалі і ад замка да двара быў падземны ход. Малы замак у Красках мае вежы (аплеценыя раслінамі) і яны так выглядаюць, быццам каралева з байкі чакала свайго прынца. У замачку была дзіцячая санаторыя, а цяпер стаіць пусты, даядае яго нішчымніца. Вакол муроў замка знаходзяцца глыбокія нішы, прыкрытыя ямы і падземныя ўваходы. Пра пана Сегеня людзі нічога не маглі сказаць, а замка пільнаваў сабака.

Падароск і Краскі — дзве вёскі, у якіх на першы погляд няма нічога цікавага. Трэба больш уважна прыгледзецца, каб убачыць не толькі прыгажосць архітэктурных помнікаў, але вясковай прыроды і зычлівых усмешак вясковых людзей.

Анна Садоўская

Дом Касцюшкі адновяць цягам 2003-2005 гадоў

На працягу 2003-2005 гадоў плануецца рэканструяваць сядзібны дом Тадэвуша Касцюшкі ва ўрочышчы Мерачоўшчына Івацэвіцкага раёна, што на Брэстчыне. Рашэнне аб гэтым прынята на пасяджэнні каардынацыйнага савета па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны пры Брэсцкім аблвыканкаме.

Сакратар каардынацыйнай рады Леанід Несцярчук паведаміў, што пытанне аб неабходнасці рэканструкцыі дома Касцюшкі абмяркоўвалася даўно. Некалькі гадоў таму імя славутага палітыка Рэчы Паспалітай, кіраўніка нацыянальна-вызвольнага паўстання 1794 года было ўвекавечана — ва ўрочышчы Мерачоўшчына ўстанавілі мемарыяльны знак і памятную дошку. Рашэнне аб рэканструкцыі сядзібнага дома Несцярчук назваў „вялікай перамогай”.

Пытанне аб рэканструкцыі сядзібнага дома і стварэнні там мемарыяльнага музею будзе вынесена на пасяджэнне аблвыканкама. Ужо створана рабочая група на чале з намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанідам Цупрыкам, якая будзе займацца арганізацыяй работ і кіраваць іх ходам. Частку фінансавання возьмуць на сябе абласны бюджэт і бюджэт Івацэвіцкага раёна. Чакаецца таксама дапамога з боку міжнародных фондаў, што носяць імя Касцюшкі (Тадэвуш Касцюшка з’яўляецца ганаровым грамадзянінам Францыі, нацыянальным героем ЗША і Польшчы).

Мемарыяльны комплекс-сядзіба павінен быць уключаны ў акгыўны турыстычны бізнес, лічыць Несцярчук. У планах — аднаўленне палацава-паркавага ансамбля Пуслоўскіх, Косаўскага палаца, які знаходзіцца побач з месцам, дзе нарадзіўся Касцюшка. У XIX стагоддзі вядомы род Пуслоўскіх наўмысна пабудаваў палац паблізу ад сядзібы Касцюшкі. Згодна з даследаваннямі гісторыкаў, Пуслоўскія меркавалі, што даглядаючы за домам, дзе нарадзіўся кіраўнік нацыянальна-вызвольнага паўстання, яны праславяць сябе. Як расказаў Л. Несцярчук, сядзібны дом Касцюшкі быў знішчаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Косаўскі палац — часткова спалены ў 1944 годзе, а гістарычны парк вакол палаца — вырублены ў 1960-х гадах.

Валянціна Казловіч, БелаПАН

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Тры пары акуляраў

Дзядулю раніцай пытае
Унучка слаўная Барбара:
— Ці гэта праўда, што ты маеш
Аж тры пары акуляраў?

— Так, да чытання і да далі
Патрэбныя мне, дарагая.
А трэція таму прыдбалі —
Як першых і другіх шукаю.

Чаму не памыў зубоў?

Спаць сынок легчы гатоў,
Да сну замыкаюцца вочы.
— Чаму не памыў ты зубоў? —
Спыталася маці сыночка.

На мамы пытанне на здзіў
Адказвае гэтак Даніла:
— Таму я зубоў не памыў —
Не месціцца мне ў роце мыла.

Ігар Сідарук

Чалавечак

Носік, вушы,
Роцік, вочка.
Галава —
На агурочку.
Ручкі, ножкі
ў чалавечка.
Атрымаўся
Недарэчка!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

І „б” клас гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

* * *

Упаў з неба мяккі снег,
быццам развязаўся мех.
Сціснуў моцна і мароз,
пячэ ў шчокі, пячэ ў нос.
А ў калядныя святы
спевакі прыйшлі ў хату.

Раман Лушчынскі, VI „б” кл.
ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Сустрэча ў І „б”

Сябры з І „б” класа, што ў бельскай „тройцы” часта пішуць у „Зорку”. Пра школьныя здарэнні, пра экскурсіі, пра свае поспехі і ўдачы. Нашы чытачы мелі магчымасць даведацца пра „Атрасіны” ў І „б”.

— Наш клас актыўны і зладжаны, — кажуць гімназісты. Сярод іх ёсць удзельнікі прадметнага конкурсу па беларускай мове, дэкламатары, заўзятары роднай традыцыі.

У класе 25 асоб, іх выхавацелькай Альжбета Навацкая. Восенню вучні наведалі Тыкоцін і Харошчу. Усім запамяталася сінагога ў Тыкоціне і палацавы ансамбль у Харошчы. Экскурсія прыблізіла не толькі архітэктуру Падляшша — гімназісты мелі магчымасць бліжэйшага знаёмства. Многія з іх раней вучыліся ў паралельных класах, іншыя прыйшлі з іншых бельскіх школ. Зорка

Дзённік Міколы

Мёдзік і чары

Разам з Тамашом і Яркам мы думалі, як перахітрыць хлус-канта. Нор Узі параіў, што хлусня мае буць мілай і салодкай, мы павінны расхваліць прадмет да такой ступені, каб ён сам у сябе закахаўся і збіўся з панталыку.

— Ведаю! — першую думку падказаў Тамаш, — скажам яму — вы геніяльны настаўнік, вы так грунтоўна і ўсебакова адукуеце нашу Аню! Вы адкрываеце ёй вочы на свет і ўсё-ўсё.

Прапанова нам спадабалася і Нор Узі рашыў, што нам трэба прыдумаць маленькае ілгунства. На добры пачатак.

Мы выйшлі на луг, дзе шпацыравала Аня з хлус-кантам. Падышлі да яе. Тамаш ужо хацеў маніць, але Нор Узі спыніў яго.

— Хвілінку, — сказаў ён, — усё у свой час, хлопча.

— Аня, як там твае справы? — усміхнуўся мастак.

— А вам што да мяне? — адбуркнула Анка і ўжо хацела адыходзіць.

— Пачакай, Аня, — сказаў ласкава Нор Узі.

— Цікава, навошта?

— Навошта? — Нор Узі зноў усміхнуўся і падмаргнуў Тамашу.

— Дарагі пан хлус-кант, — Томак стаў на зважай і гаварыў узрушаны, — я хачу вам падзякаваць за тое, што вы такі ГЕНІЯЛЬНЫ і за ўсё тое, што робіце нашай сяброўцы Ані. Вы зрабілі яе мудрым назіральнікам і ўсебаковым аналітыкам. Вы спрычыніліся да таго, што побач нас няма хлусні і насмешкі. Гэта вялікі гонар, што наша сяброўка можа быць вашай вучаніцай. Дзякуючы ёй і мы адчуваем сябе лепшымі і больш справядлівымі...

У час калі Томак хваліў і захапляўся, хлус-кант чырванеў усё мацней і мацней. У канцы ён не вытрываў таго дабра.

— Б-у-у-у-у-х!!! — ляснуў ён і рассыпаўся на сотні асколкаў.

Думаеце, што канец гэтай гісторыі?

Не, дарагія. Тыя асколкі, быццам пад уплывам нябачнага магніту, зноў зляпіліся і з іх стаўся... Чорны кот!

— Не ведаю, — пакруціў галавою Нор Узі. — Не ведаю, што тут.... Лепш сядайце хутчэй у Андралекс. Іншым разам падрыхтую вам экскурсію па Краіне Гот. О-кей?

І мы мігам селі ў Андралекс, а там, што ўсіх здзівіла, стаялі нашы багажы. Зноў ляцелі між светам і краінамі, а Аня ўсю дарогу спала. Яна вярталася да сябе. (працяг будзе)

(нак-с)

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя узнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 51: Ас, фасфарыт, ферма, віяланчэль, ял, анёл, марка. Фіга, фея, арляк, смала, фан, час, ордэн, лёс.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Паўліна Мароз** і **Марцін Аляксандрук** з Новага Корніна, **Ева Сегень** з Беластока, **Ева Шырэнос** і **Ева Казлоўская** з Бельска-Падляшскага, **Эмілія Антасюк**, **Адрыяна Кот** з Гайнаўкі, **Уля Рашкоўская** і **Мартына Кананічык** з Нарвы. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міхась Сцепанюк (першы злева) і Тамаш Суліма (стаіць) на Сустрэчах „Зоркі"

Беларускасць не толькі на зважай!

З Міхасём СЦЕПАНЮКОМ і Тамашом СУЛІМАМ — заснавальнікамі „Клуба беларускіх спраў" у бельскім беларускім ліцэі, гутараць гімназісткі бельскай „тройкі".

Кася Краўчук: — ***Многа гадоў мы чыталі ў „Зорцы" твае артыкулы на вельмі розныя тэмы. Яны нас зацікавілі. Я хачу даведацца, калі ты пачаў цікавіцца беларускай культурай.***

Міхась Сцепанюк: — Мая дзейнасць пачалася, калі я стаў свядомым беларусам. У трэцім класе наша настаўніца Валянціна Бабулевіч умела мяне зацікавіць беларускай мовай, культурай. Я чытаў „Ніву", „Зорку". Сустракаўся з Дарафеем Фіёнікам. У чацвёртым класе напісаў у „Зорку" артыкул аб экскурсіі ў Люблін. Тады запрасілі мяне на Сустрэчы „Зоркі", якія арганізавала Ганна Кандрацюк. Потым мы пачалі прымаць удзел у школьным калабарэ „Куль".

Юстына Тарасюк: — ***Томак, а калі ты пачаў дзейнічаць на беларускай ніве?***

Тамаш Суліма: — Мая дзейнасць пачалася недзе ў 1997 годзе. Гэта была „Ніва", Дарафей Фіёнік. Пачаў пісаць у „Зорку". Тады ўпершыню паехаў на Сустрэчы „Зоркі". Такая сур'ёзная дзейнасць на беларускай ніве ў мяне працягваецца ўжо пяць гадоў.

Кася Краўчук: — ***Што, альбо хто спрычыніўся, што вы сталі свядомымі беларусамі?***

Міхась Сцепанюк і Тамаш Суліма: — Было сапраўды некалькі важных асоб — Дарафей Фіёнік, Ганна Кандрацюк і Чарак Хіліманюк.

Юстына Тарасюк: — ***Вы арганізавалі ў ліцэі „Клуб беларускіх спраў". Скажыце, калі ласка, чым ён займаецца і якая мэта існавання клуба?***

Міхась Сцепанюк і Тамаш Суліма: — Будучы ў ліцэі мы сустракаліся з гайнаўскімі ліцэістамі, якія стварылі „Клуб польска-беларускіх спраў". У 2001 годзе мы ў школе правялі апытанне сярод вучняў чацвёртых класаў. Гэтае апытанне выявіла, што толькі 7% вучняў адчуваюць сябе свядомымі беларусамі. У маі 2001 года мы рашылі таксама заснаваць клуб. Наша дзейнасць пачалася з канцэрта „Беларускасць не толькі «на бачнасць»". У дзейнасці клуба памагаў настаўнік Уладзімір Вавульскі, ён інтэграваў вучняў першага класа. Нашая мэта — паказаць, што можна быць вясёлым беларусам без комплексаў.

Кася Краўчук: — ***Ці дзейнасць на беларускай ніве не перашкаджае вам у навуцы?***

— Напэўна не перашкаджае. Праўда, яна займае многа часу, прапускаем урокі і, вядома, потым трэба даганяць іншых. Але варта сказаць, што зацікаўленне беларускай культурай і тым, што мы свядомыя беларусы была вялікім штуршком да ўдзелу ў Алімпіядзе беларускай мовы, лаўрэатамі якой мы сталі.

Юстына Тарасюк: — ***Вы ўжо ў матуральным класе. Скажыце, калі ласка, што далей з вашым клубам, ці маеце каму перадаць сваю дзейнасць?***

— Калі б ты паставіла нам гэтае пытанне ў мінулым годзе, дык мы сказалі б, што не, што ідэя памерла пасля паўгода, але аказваецца, што ёсць каму перадаць. Менавіта людзям, якія паявіліся ў нас у школе. Яны вельмі цікавяцца беларускай культурай і адчуваюць сябе беларусамі. Мы маем надзею, што яны будуць праяўляць ініцыятыву і ахвоту прапагандаваць беларускую думку.

— Дзякуем вам за размову.

Гутарылі Кася КРАЎЧУК і Юстына ТАРАСЮК, вуч. II „ц" класа Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Ёлачка

Ўзышла у лесе ёлачка,
У лесе і расла,
Узімку, ўлетку стройная,
Зялёная была.
Мяцеліца ёй песеньку
Пяяла: баю-бай,
Мароз сняжком атуліваў:
Глядзі, не замярзай!
Пужлівы зайчык шэранькі
Пад ёлачкай скакаў,
Падчас і воўк, сярдзіты воўк,
Ускоч перабягаў.
Вось снег у лесе дрэмлючым
Пад полаззем скрыпіць,
І конік жвава, сівенькі
Спяшаецца, бяжыць.
Вязе той конік саначкі,
А ў санках селянін,
Пад'ехаў ён пад ёлачку
І ссек у міг адзін.
Цяпер яна прыбраная
На свята к нам прыйшла
І шмат пацехі, радасці
Для дзетак прынясла.

З рускай пераклаў Я. Купала

Ёлачку ведаюць усе

Мелодыя „Ёлачка" напісана кампазітарам Я. К. Бекманам на верш Раісы Адамаўны Кудашавай (1878-1964) „В лесу родилась ёлочка". Ніводнае навагодняе свята на працягу цэлага стагоддзя не праходзіць без гэтай песні. Яе ведаюць усе — ад немаўлят да людзей шаноўнага ўзросту. Менавіта яна прынесла вядомасць і папулярнасць паэтэсе, якая аднойчы завітала ў кабінет да пісьменніка Фадзеева.

Сакратар паведаміў, што прыйшла незвычайнага выгляду жанчына: у лахманах, уся трасецца і патрабуе сустрэчы з аўтарам „Маладой гвардыі".

Сустрэча адбылася. Наведніца прасіла дапамогі. На пытанне, хто яна і адкуль, жанчына паведаміла, што ў свой час яна скончыла жаночую гімназію М. Б. Пусен, працавала гувернанткай, настаўніцай, бібліятэкарам. Друкавала вершы пад ініцыяламі „А. Э".

На прапанову назваць хоць адзін з вершаў, жанчына адказала: „В лесу родилась ёлочка". Узрушаны Фадзееў успомніў як, будучы хлопчыкам, ён плакаў, калі слухаў радкі песні: „Срубил он нашу ёлочку под самый корешок".

Тут жа распарадзіўся залічыць наведвальніцу ў Саюз пісьменнікаў і выдаць ёй матэрыяльную дапамогу, дадаўшы пры гэтым: „Кожны з нас толькі марыць можа аб такой папулярнасці сваіх твораў".

Раіса Адамаўна перажыла свайго збавіцеля на 8 гадоў.

Застаецца дадаць, што на беларускую мову гэты верш пераклаў Янка Купала.

Тамара ЛАЎРЭНЧЫК

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сябры „Зоркі" з Беластока (ПШ н-р 4)

Уладзімір АРЛОЎ, Адкуль наш род

Беларусь і Напалеон

Бясслаўныя ўцёкі

Напалеонаўскаму войску ўдалося заняць Маскву, але разбіць царскую армію, якою камандаваў Кутузаў, ён так і не здолеў. У кастрычніку французы пачалі адступаць. Неўзабаве расійскія войскі з дапамогаю партызанаў выбілі іх з Полацка, Віцебска, Магілёва, Мінска ды іншых беларускіх гарадоў.

Недалёка ад Барысава французы з вялікімі стратамі пераправіліся цераз раку Бярэзіну. Іх адступленне ўсё больш нагадвала ўцёкі. Ад магутнай Вялікай арміі засталіся галодныя, абмарожаныя купкі жаўнераў, што панура брылі на захад, туды, адкуль прыйшлі.

У беларускім мястэчку Смаргонь Напалеон пераапрануўся ў чужы мундзір і пад чужым імем пакінуў войска, спяшаючыся ў Парыж. Ён казаў сваім прыдворным, што праз год прывядзе трыста тысяч жаўнераў і ўсё адно паставіць Расію на калені.

Гэтыя планы не здзейсніліся. Недзе на беларускай зямлі, магчыма на дне аднаго з нашых шматлікіх азёраў, застаўся ляжаць кінуты Напалеонам падчас уцёкаў яго залаты скарб.

У 1812 годзе Беларусь страціла мільён жыхароў, чвэрць усяго насельніцтва. Адны загінулі ў баях, другія памерлі ад голаду і пошасцяў. Тысячы нашых землякоў, што служылі ў напалеонаўскім войску, мусілі адступіць за мяжу і ваяваць на чужыне за чужыя інтарэсы.

Пасля вайны 1812 года тыя, хто марыў вызваліць Бацькаўшчыну, зразумелі, што трэба разлічваць толькі на ўласныя сілы.

Узнагароджаны пастэльны партрэт аўтарства Тамары Кердалевіч

партрэтаў выкананых традыцыйнымі тэхнікамі.

Камісія, якую складалі гайнаўскія мастакі Іаанна Кярсноўская, Віктар Кабац і працаўнікі Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку Зыгмунт Цясельскі і Крыстына Куніцкая, узнагародзіла Тамару Кердалевіч за пастэльныя партрэты, Еву Галашэвіч за партрэты выкананыя вуглём і Баляслава Паўлоўскага за разьбу „Задуманы мужык". Вылучэнні за жывапісныя работы атрымалі Павел Верамюк, Барбара Грабяк, Марта Дамброўская, Дыяна Астапюк-Янчук, Вітальд Алексяюк і Андрэй Ялоза. Камісія вылучыла інтарсію Люцыны Давідзюк, разьбу Яраслава Міхальчука і бацікі выкананыя Паўлам Данілюком і Альжбетай Кубіцкай. Па-за конкурсам Ядвіга Кучкін, выконваючая абавязкі дырэктара ГДК, прызначыла ўзнагароду Баляславу Гвоздзіку за алейную работу „Млын". Дыпломы і грашовыя ўзнагароды ўручаў у час мерапрыемства намеснік бурмістра Гайнаўкі Міраслаў Мордань.

Лепшыя — рэалістычныя

Да IX Агляду непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі, арганізаванага ў Гайнаўскім доме культуры, прыступілі 30 асоб, якія прынеслі 110 работ. На выстаўцы, якой адкрыццё адбылося 15 снежня, прадстаўлены найлепшыя мастацкія працы, а сярод іх карціны, разьба і кераміка. Многа было

Камісія высока ацаніла ўзнагароджаныя работы і нізка агульны ўзровень. Лепшымі аказаліся рэалістычныя работы, а слабейшымі сюррэалістычныя працы. Каб павысіць якасць работ, Іаанна Кярсноўская прапанавала арганізаваць перад аглядамі кансультацыі з прафесійнымі мастакамі.

Аляксей Мароз

У пошуках хросных

Пачатак студзеня — добрая нагода для падвядзення вынікаў мінулага года. Летась шырока адзначаліся беларускія мерапрыемствы. На Гайнаўшчыне таксама было іх шмат. Гучна святкаваліся юбілеі „Цаглінак" і „Хлопцаў-рыбалоўцаў", вядомых не толькі ў нас, але ва ўсёй краіне і па-за яе межамі. У час юбілейных канцэртаў спонсары шчодра абдаравалі абодва калектывы.

Больш за дваццаць гадоў існуе наш гайнаўскі хор. Дзейнічае ён пры Гайнаўскім доме культуры на грамадскіх пачатках; харысты не атрымоўваюць грашовай кампенсацыі за страчаны час на рэпетыцыі і канцэрты. Аднак за гэты час не ўдалося прысвоіць хору імя, хаця прапанавалася пад трыццаць назваў. Не было ўрачыстасці „хрысцінаў" хору, з удзелам „кума" і „кумы" — ганаровых апекуноў калектыву. Не раз харысты прымервалі новыя строі, спадзеючыся пры тым „хрысцінаў".

На маю думку, хор павінен атрымаць назву. Гэтаму павінен пасадзейнічаць Павятовы аддзел БГКТ у Гайнаўцы. Аднак сам аддзел таксама патрабуе рэанімацыі, пераадолення калапса, у якім ён апынуўся. Невядома каго спярша ратаваць: хор ці аддзел? А прычын такому стану рэчаў шмат. Адна з іх — нястача часу ў вопытных, заслужаных дзеячаў займацца культурай. Многа часу займаюць ім выбары то ў парламент, то ў мясцовыя самаўрады. Яны пераважна думаюць аб мяккіх крэслах і хутка забываюць аб абяцаннях наконт беларускай справы, якімі туманілі сваіх выбаршчыкаў.

У Гайнаўцы — прыгожым прыпушчанскім горадзе — павінен існаваць не толькі беларускі хор, але эстрадны калектыў кшталту колішняй „Лявоніхі" і беларускі тэатр. Таленавітых людзей у горадзе шмат. З пачаткам года Гайнаўскі дом культуры ўзначаліў новы дырэктар. Спадзяюся, што неўзабаве і гайнаўскаму хору знойдуць хросных і справяць „хрысціны", а ляўкоўскія „Цаглінкі" са сваім вядомым салістам праспяваюць ім славутую песню „Нёман".

Віктар Бура

Паэтычныя песні бардаў

Пра што сніць сны крыніца

У папярэднім артыкуле нашага бардаўскага цыкла мы распавялі пра яркую прадстаўніцу беларускіх спеўных паэтаў — Лану Медзіч. А вось творчасць Вольгі Сідарук хоць і блізкая ёй паводле ўвасаблення тонкіх лірычных настрояў і выканаўчай манеры, аднак, належыць да зусім іншай плыні гэтага жанру. Тут гаворка пойдзе аб прафесійнай паэзіі (часам і класічнай), рэанімаванай да новага жыцця дасціпнымі выканаўцамі-песнярамі.

Выдатная паэзія Ніны Мацяш, Алеся Каско, Анатоля Дэбіша, Вінцэся Вашэкі ды іншых герояў берасцейскага літаратурнага кола склала матэрыял першага сольнага альбома Вольгі Сідарук (адсюль і назва, што сімвалізуе дружнае кола ля сяброўскага вогнішча). Рэліз стаў магчымым дзякуючы пільным намаганням дыхтоўнай мінскай лічбавай студыі „Limas" і яе фундатара Кастуся Елісеева.

„Дабрачынныя замежныя і гуманітарныя айчынныя фундацыі,— як напісана ў буклеце гэтай касеты,— да выдання альбома не спрычыняліся". А шкада, бо гэты яўна некамерцыйны праект вельмі цёпла сустрэла і публіка, і прэса, але паспрабуйце знайсці яго ў шыкоўных музычных крамах. Грошай на вялікія тыражы і адпаведную раскрутку ў выдаўцоў яўна не стае.

„Музыкальная газета" пісала тым не менш адназначна: „Вольга Сідарук прыцягвае не толькі чароўнымі мелодыямі ды пяшчотнымі гітарнымі пераборамі, але і проста наяўнасцю голасу. Сучасная эстрада прымусіла нас забыць, што такое спеўны голас, але ў Вольгі ён ёсць, і даволі шырокага тэмбравага спектру — ад сапрана і вышэй" („Музыкальная газета" № 30 за 1.08.2000 г.).

Прадбачваючы іранічнае стаўленне многіх чытачоў да нейкай асаблівай „чароўнасці" бардаўскіх мелодый, якія нярэдка вандруюць з песні ў песню без істотных зменаў, спынюся менавіта на гэтым аспекце. Бо сапраўды, шчыра кажу, Бог даў Вользе Сідарук талент адкрыцця ўласных непаўторных мелодый. Іхні надзвычайны арэол зацягвае слухача ўжо ад першай песні „Цудоўная пані" на вершы Вінцэся Вашэкі. І ты ловіш сябе на думцы, што гэта тая бардаўская песня, якую не кожны дамарослы бард здолее падхапіць, зняўшы акорды. Процьмай талентаў трэба валодаць для гэтага.

А свае вакальныя таленты і тонкае адчуванне паэтычнага слова кампазітар Вольга Сідарук эксплуатуе без жалю, самаахвярна аддаючыся песні. Адным з супер-гітоў альбома я назваў бы „Калыханку бусліхі", дзе бардэса ўдала спалучыла знакамітую фальклорную мелодыю „Люлі-люлі, прыляцелі гулі" з уласным экзерсісам на вершы Міколы Пракаповіча:

Крылцы стаміліся ціхенька-ціха —
Радасць і ўцеха мая.
Спіце, засніце — ужо й салаўіха
Кліча ў гняздо салаўя.
Пушча заснула, пад дубам крыніца
Мора далёкае сніць,
Толькі на тоненькай-тонкай галінцы
Месячык срэбна звініць.

Розныя крыніцы так гарманічна зліліся ў гэтым творы, што калі выйшла першае выданне альбома, дзе ў сціплым буклеце не было пазначана ўсіх аўтараў, многія ўспрынялі яго як вынік творчага плёну аднаго чалавека — бардэсы Вольгі Сідарук. Ды і сёння гэтак — цэльна і пераканаўча — успрымаецца ўвесь альбом.

Зрэшты, гаворка пра цэльнасць таксама мае пэўны ўмоўны характар, бо пры жаданні з твораў альбома можна вылучыць і своеасаблівыя манументальныя глыбы („Ноч" на вершы Аляксея Белага, „Выспелі яблыкі" на вершы Зінаіды Дудзюк), і гэткія зухаватыя настраёвыя замалёўкі („Вераснёўскі дождж" і „Цыганская" на вершы Васіля Сахарчука, „1864 год" на вершы Міколы Купрэвіча).

Разнастайная і жанравая палітра праглядае ў гэтай цэльнасці. Даследчыкі адзначаюць і пранікнёную лірыку кахання, і гісторыка-публіцыстычны нацяг, і ўзвышанасць рэлігійных матываў у гэтых песнях. І нават лірыка не абмяжоўваецца сціплым наборам стандартных штампаў кшталту „а я лягу-прылягу галавой на карчагу — хай праедзе машына па дурной галаве". Гэтую лірыку вылучае шчырасць пачуццяў, багацце мастацкіх фарбаў, дасканаласць паэтычнай мовы. Вось хоць бы як у песні „Запрашэнне на танец" на вершы Аляксея Белага:

Для нас саксафон і габой
Пяюць і галосяць.
Давай патанцуем з табою —
Хай нам пазайздросцяць.
Хай з цемры глядзяць у вакно
Півоні і ружы,
А нас саладзей за віно,
Каханне закружыць.

Самае дзіўнае, што гэты камерцыйна нераскручаны прадукт ужо вытрываў два выданні. А мо дзівам было б якраз адваротнае: каб гэткі саюз выдатнай паэзіі, унікальнага голасу і бездакорных кампазіцый застаўся б нейкім незапатрабаваным.

Над мастацкай аздобай альбома працаваў Кастусь Елісееў, гукарэжысёр — Павел Захаранка, майстарынг — Уладзіміра Бярберава.

Альбом Вольгі Сідарук „Берасцейскае вогнішча" значна пашырыў уяўленні прыхільнікаў бардаўскай песні і аб жанравым, і аб геаграфічным арэоле ейнага існавання ў Беларусі: Мінск, Гомель, Полацк, Гродна, Орша, Ліда, Брэст і г.д. Ці не час падумаць пра месца для грандыёзнага фестывалю?

Вітаўт Мартыненка

Плён VII Агульнапольскага конкурсу паэзіі і прозы

Дэтэктыў

Сэрца — найлепшы шпіён,
Яно так хоча даведацца
Усё, даслоўна ўсё,
Усё прыняць да ведама.
Сэрца, бы той дэтэктыў:
Ходзіць па сцежках нязведаных,
Дзе яшчэ след не прастыў,
Усё імкнецца даследаваць.
Ёсць горад, вуліца, дом
Аб'ект адзін перахоўваюць.
Там шанц адзін на мільён,
Беспамылкова прыгожы ён.
А што ў яго за душа!
(Тут справа не толькі ў целе):
Дашліфаваны брыльянт
Так зіхаціць не ўмее.
А можа гэта ўсё зман,
Здаля бы тая ляля?
Таму стараюся так,
Ды інфармацый шукаю,
А пакуль што... неяк так...
Пара вачэй як неоны...
На гарызонце гараць...
Клічуць мяне і трывожаць.

Цётка Мальвіна

Лес

О, цудоўны лес,
Ты заўсёды чароўны,
Поўны таямніц
І казачна размоўны.
Хто цябе не ведае,
Павінен скора пазнаць.
Ты наш паратунак,
Будзем цябе праслаўляць,
Шанаваць і апекаваць,
Каб рос ты буйна пад чыстым блакітам
Без агню і крадзяжу
І рады быў нашым візітам.
Лес пастаўляе нам кісларод,
Каб маглі мы жыць.
І як такім скарбам
Нам не даражыць?

Мікалай Панфілюк

Маляваў для храмаў

Феліксу Аршаловічу з Новага Двара ўжо 92 гады. У наваколлі ён вядомы як выдатны жывапісец.

Ужо ў школе настаўнік намаўляў мяне пісаць карціны, — кажа мастак. — Я закончыў пачатковую школу ў Новым Двары, але далей не мог вучыцца, бо маці, удава, не мела грошай.

У войску служыў у Лідзе. Жаніўся паручнік і я яму намаляваў віншавальны лісток. Ён падзякаваў:

— Dziękuję uprzejmie za tę piękną laurkę!

Мы адказалі:

— Życzymy awansu na kapitana!

У час вайны быў у нямецкім палоне. Напісаў алоўкам партрэт свайго калегі. Прыйшоў баўэр, паглядзеў на рысунак і пытае:

— Якая твая прафесія?

— Земляроб.

— Не, ты па прафесіі мастак!

У Судэтах, дзе я тады прабываў, быў такі звычай, што партрэт салдата, які загінуў за радзіму, вешалі ў касцёле. Прынеслі мне картачку аднаго салдата; ён быў там у чэшскім мундзіры, а захацелі, каб намаляваць яго ў нямецкім. Я не ведаў, як гэта зрабіць, але нарысаваў я яго тушшу і выйшаў ён прыгажэйшы за той на здымку. Мне гаварылі:

— Felix, du schoen malen, dein Bild ist in Kirche.

І вахману партрэт намаляваў. І сябе намаляваў з выцягнутай уверх рукою і падпісаў „Liebe ganze Welt".

Калі вярнуўся ў Новы Двор, таксама маляваў. Бывала, пасля працы браў фарбы і маляваў. Альбо кароў прывяду ў абору, а сам за мальберт. Ксяндзам на дзень нараджэння ў падарунак маляваў карціны. Адзін з іх, якому я намаляваў абраз Маткі Боскай Чанстахоўскай, сказаў:

— Szkoda, że w GS-ie malujesz przy takim talencie.

Я і сам шкадаваў, што няма часу маляваць, але ж трэба было закладаць ГС... Шмат рэлігійных сюжэтаў напісаў я. Звыш дзесятка абразоў узяў ксёндз Андрукевіч у капліцу ў Кярснове.

І для царквы маляваў абразы: „Пакроў", „Хрыстос блаславляе дзяцей", Святога Мікалая. Ранейшы бацюшка гаварыў:

— Надто хорошо сделаны!

Калі адбудавалі царкву ў Новым Двары і прывезлі захаваныя ў Ячне абразы, якія раней былі ў раскіданай навадворскай царкве, я аднаўляў іх; былі на іх дзіркі, царапіны. Тры вялікія царкоўныя абразы не змяшчаліся ў хаце, дык я аднаўляў іх у сваёй стадоле.

Падабаліся мне коні, такія, як на карцінах Хелмонскага. І я напісаў некалькі такіх абразоў, яны цяпер у дачкі ў Бельгіі.

За цыкл карцін пра сялянскую працу ўзяў я першае месца; паказвалі іх пасля на выстаўках у Беластоку і Кракаве. Былі там чатыры карціны: „Аранне" — араты з плугам і двума коньмі, „Сяўба" — колішняя, з плахты, а жанчыны баранавалі, „Жніво" — мужык з касою і пахіленая жанчына з сярпом і „Пячэнне хлеба" — адна жанчына месіць у дзежцы, а другая стаўляе буханкі ў печ.

Многа абразоў напісаў я, але многа і раздаў людзям. Жонка сварылася:

— Навошта іх раздаеш! А ведаеш, што яны з імі робяць? Мо выкідаюць куды!

Калі ляжаў у шпіталі, трох мужчын аддалі мне кроў, дык я аддзячыўся карцінамі. Шмат карцін аддаў сямейнікам. Маляваў да 85 гадоў.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Фота Янкі ЦЕЛУШЭЦКАГА

Бацькі і дзеці спявалі калядкі

У Пачатковай школе ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) завялася традыцыя — вучнёўскі самаўрад і яго апякунка настаўніца Галена Рэент запрашаюць у школу бацькоў на мерапрыемства пад загалоўкам „Супольнае спяванне калядных песень". Гэтак было і ў канцы 2002 года.

Бацькоў, дзяцей, бацюшку Славаміра Троца і запрошаных гасцей прывітаў дырэктар школы Валянцін Барташук. Затым школьнікі выступілі са спектаклем „Раждзяство Хрыстовае".

Настаўніца папрасіла бацькоў расказаць, як яны ў свае маладыя гады хадзілі калядаваць з гвяздай. Найцікавейшы быў расказ Канстанціна Карпюка з Капітаншчыны. Аказваецца, тамашняя моладзь хадзіла калядаваць нават у Крыніцу, якая знаходзіцца на другім баку Белавежскай пушчы. А якія рабілі тады гвязды — нават т.зв. двух- і трохрадкі! Вельмі прыгожыя, вынаходлівыя. Крынічане раней не чулі такіх песень, якія спявалі каляднікі з Капітаншчыны, таксама пушчанскай вёскі, але распаложанай над ракою Нараўкай. А якія толькі калядоўшчыкам прыгоды не здараліся. Столькі ж дарогі трэба было прайсці лесам ды поначы. Моладзь вельмі чакала Каляд, а калі ўжо прычакала дык весялілася.

Так вось і пачалі спяваць усе, хто прыйшоў вечарком у школу ўсім вядомыя калядкі. Пачалі ад каляднай песні „Ой на моры, моры", а далей ужо былі „Ішла звязда чудна", „Гэй, высоко ў сінім небе". У перапынках бацькі ўспаміналі, якія раней былі дапросіны, калі заходзілі ў двор або ў хату, каб спяваць. Дзецям цікава было даведацца, што паўвеку таму рыхтавалі на калядны стол ды як яго прыаздоблівалі. А яшчэ, як варажылі пасля каляднай вячэры. Напрыклад, у нас гэта называлі „цягнулі лён" (сена з-пад абруса).

У школе арганізавалі таксама калядны пачастунак. Калі крыху падсілкаваліся, тады заспявалі „Раждзяство Хрыстова", „Радуйцеся ўсе людзі", „Скінія златая", „Учора з вячора засвяціла зора". На заканчэнне ўсе праспявалі „Неба і зямля". Усе сабе зычылі, каб сустрэцца на такой вечарыне ізноў праз год. На памятку зрабілі здымак усім удзельнікам сустрэчы. Будзе ён захоўвацца ў школьнай хроніцы.

Настаўнікам стараляўкоўскай школы вялікае дзякуй за тое, што робяць, каб традыцыя спявання калядак не загінула. Варта дадаць, што з кожным годам калядныя песні прыходзіць спяваць усё больш і больш бацькоў.

Янка Целушэцкі

Ёлка для праваслаўных дзяцей у Гайнаўцы

Праваслаўнае брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія ў Гайнаўцы ды Брацтва праваслаўнай моладзі ў Гайнаўцы арганізуюць 25 студзеня 2003 года, а гадзіне 15^{00} у Гайнаўскім доме культуры ёлку для дзяцей ва ўзросце да 10 гадоў.

Заявы і 20 зл. за падарунак-пачку прымаюць у бюро Брацтва, у кожную нядзелю, да 15 студзеня 2003 года. Дэталёвую інфармацыю можна атрымаць пад нумарамі тэлефонаў: 873-47-23 і 683-23-47. (яц)

Сардэчна дзякуем...

... нашым чытачам і ўстановам, якія павіншавалі нас з Калядамі і Новым годам.

Рэдакцыя

Гісторыя крыжа ў Кузаве

На раздарожжы кузаўскай вуліцы стаіць крыж. Устанавіла яго моладзь у 1989 годзе ў гонар Тысячагоддзя Хрышчэння Русі. Ініцыятарамі пабудовы помніка былі Раман Сідарук, Славамір Саўчук і Юры Качук. Матэрыял прызначыў аднавясковец Антон Волчук. Духова ўспамагаў маладых святар мясцовага прыхода Георгій Крысяк. Раней у гэтым месцы стаяў таксама крыж, але згніў. Калі я паспрабаваў пазнаць гісторыю, дык Сафія Калішэвіч сказала:

— Кузаўцы ў вайну яго паставілі. Апрача таго, два іншыя. Адзін насупраць царквы, а другі пры дарозе за вёскай, едучы ў Кляшчэлі. Мужыкі вечарамі рабілі. Немцы не дазвалялі ставіць. Жанчыны выткалі льняное палатно. Захуталі іржаны хлеб і закапалі пад крыжамі. Гэта мела быць падзяка Богу за тое, што жандары не спалілі вёску пасля таго, як партызаны ў вашай хаце немцаў пастралялі. Рытуал быў таксама падзякай за шчаслівае вяртанне вашага бацькі з канцлагераў.

— Не было тут ніякага крыжа, — канстатаваў Сяргей Рэпка, сядзіба якога мяжуе з крыжам. Стаяў, але пад лесам, пры волянскай дарозе. Надзея Панасюк паставіла па смерці мужа.

Версія Сяргея Рэпкі аказалася непраўдзівай. Названая ім жанчына сказала:

— Гэта ваш крыж. Па бацьку паставілі, каб шчасліва дамоў вярнуўся. Татуль наш памагаў ставіць. Пры высвячэнні была, — працягвае Надзея Панасюк. — Маці ваша моцна плакала...

— Маці наша казала, — дадае Люба Саўчук, суседка Надзеі, — што крыж Хведару Сідаруку пад лесам паставілі. Сям'я даглядала. Кветкі ставіла. Мне яксьці з памяці гэта вылецела, бо пры нямецкай акупацыі ўсяго тры годзікі мне было. Але сказанае Надзеяй Панасюк і Любай Саўчук старэйшая сястра Яўгенія пацвердзіла.

Уладзімір Сідарук

Між Прусіяй і Карэяй

Успаміны Івана ЛЕЎЧУКА з Сасін, народжанага ў 1923 г.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Першы набор на працу ў Германію адбыўся ў 1942 годзе. З Сасін солтыс вызначыў каля дзесятка чалавек. Заехалі ў Мілейчычы, а адтуль зараз фурманкамі завезлі нас у Кляшчэлі на станцыю, пагрузілі ў вагон і павезлі ў Бельск, у арбайтсамт. Трымалі нас там у бараках, асобна мужчын і асобна жанчын. Елі тое, што забралі з сабою.

Пасля тыдня пад стражай пагналі нас на станцыю і пагрузілі ў таварныя вагоны. І павезлі, а куды — невядома. Знайшліся ў тым вагоне такія, што выламалі акно і ад Райска сталі выскакваць між рэйкі. Я выскачыў за Лявіцкімі і вярнуўся назад. Ішоў пяшком цэлы час, нават чамаданчык прынёс. Не пайшоў, аднак, дадому, толькі ў Дубна, да дзядзькі. У бацькоўскую хату з'яўляўся, але дома не начаваў. Калі жандары ехалі ў вёску, я ўцякаў у лясок за рэчкай, адкуль усё мог бачыць. Як жандары ад'язджалі, я вяртаўся дадому. І так паўгода хаваўся я: то ў Дубне, то ў Дашах, а жандары мяне шукалі. Пасля яны забралі бацьку і пасадзілі ў арышт у Мілейчычах; сказалі, што выпусцяць, калі я з'яўлюся.

Я зайшоў у Мілейчычы, тады бацьку выпусцілі. У Мілейчычах была замужам маміна сястра, яна зналася з жандарамі, зайшла да іх і сказала, што ў нас тыф. Мяне выпусцілі, але вызначылі тэрмін для яўкі. Той час прыйшоў і я паехаў проста ў арбайтсамт у Бельск, бо іншага выхаду ўжо не было.

Не каралі мяне, патрымалі некалькі дзён і ў вагон. Ехалі пасажырскім вагонам, якога немец пільнаваў. Так я заехаў у арбайтсамт у Кёнігсберг. Адтуль забраў мяне шавец, які жыў трыццаць кіламетраў за горадам. У ягоным варштаце працаваў я шаўцом тры гады.

Як набліжаўся фронт, высылалі мяне акопы капаць. Спярша капаў у Літве, а пасля каля Голдапа. І зноў да гаспадара вярнуўся. Як фронт ужо падыходзіў, то я фурманкаю з будай тры сям'і вёз. Ехалі каля двух тыдняў, на Пілаў, там над морам у зямлянцы спыніліся. Цэлую ноч бамбёжка была, снарады падалі. Рана стала ціха. Немцы загадалі ісці назад, але неўзабаве рускія запынілі.

Двойчы на пытанне, хто я, адказваў, што паляк. Але ў трэці раз спісвалі адрасы і давялося назвацца беларусам. Сабралі нас групу, якую салдат вёў, а мы не ведалі, куды. Так ішлі два дні, мы перагаворваліся, што нас на транспарт дадому вядуць. Завёў у вёску, там пераначавалі, а рана атрымалі загад:

— Вещи оставляйте, сейчас вернётесь назад.

Адзін салдат папрасіў у мяне паліто:

— Отдай, я сыну, а тебе и так заберут.

Я ўбачыў кучу лахаў, то і аддаў яму тое сваё паліто. Нас абстрыглі і ў палявую лазню павялі. Увайшлі аднымі дзвярамі, а выходзілі другімі, за якімі апраналі нас у мундзіры. На другі дзень далі вінтоўку, пару патронаў выстралілі і ўсё. На наступны дзень адправілі ў часць — у 1-ю аўтаматную роту 753 пяхотнага палка; і на фронт.

І адразу на перадавую, бо была гэта штрафная рота. Мо з тыдзень часу я ў перадавой быў, ранены не быў, толькі прыглух ад выбуху снарада. Пасля мяне перавялі ў 490 стралковы полк, у якім аставаўся да канца вайны з Германіяй.

Стаялі ў лесе, у зямлянках. Аднойчы паслалі мяне з яшчэ адным салдатам на станцыю, павець над боепрыпасамі зрабіць. Пайшлі мы ў лес матэрыял шукаць. Углядаемся ўверх...

— Стой, міны! — крыкнуў той таварыш.

Я спыніўся, ён размініраваў тое месца, якое я толькі што пераступіў...

Пасля месяца пагрузілі нас на поезд і павезлі; куды — не ведалі. Ехалі тры месяцы, заехалі ў Манголію. Там, пасля выгрузкі, стаялі каля двух тыдняў у адным месцы. А пасля пяшком адправіліся ў паход. Ішлі праз пустыню Гобі і горы Вялікі Хінган. Я быў кулямётчыкам, мой супольнік самлеў і на мяне той ручны кулямёт з дыскам узвалілі. А яшчэ свой рыштунак, вінтоўку, чатыры гранаты і сто патронаў, шынель... Цэлы дзень нёс, выбіўся з сіл, сеў і што хоч. Падышоў лейтэнант і забралі ад мяне ўсё тое, што меў. Вечарам пад'ехаў самаход і частку з нас перакінулі праз тую пустыню.

Выкапалі траншэі і сядзелі. Неўзабаве паведамілі нас, што знаходзімся ў ваенным становішчы з Японіяй. Настала ноч, аб'явілі пад'ём і пайшлі. Спынілі, забаранілі курыць і гаварыць. А на досвітку — ура! І цэлы месяц там з японцамі біліся; калі б не тая бомба, то невядома, ці хто вярнуўся б. Я зноў цэлы астаўся.

Скончылася вайна, мяне перакінулі ў мінамётны полк. Жылі мы пад будамі, дзе можна было распрануцца, спалі на нарах. Я, у Прусіі і ў Манголіі, амаль год часу не распранаўся, сплючы на зямлі пад голым небам. І калі скінуў з сябе тую вопратку, дык быццам на свет нарадзіўся! Так было мо з тыдзень і нашу часць перабазіравалі ў Карэю.

Мяне перавялі ў артылерыйскі полк і там я даведаўся, што палякаў звальняюць. Пайшоў я ў штаб дывізіі, там на карце праверылі, што мая мясцовасць апынулася ў межах Польшчы, і сталі афармляць мне дакументы. Дэмабілізавалі мяне, пагрузілі на карабель і прывезлі ў правізорны порт каля Уладзівастока. І ў эшалон. Падарожжа доўжылася каля месяца, яшчэ з месяц у Маскве чакаў афармлення дакументаў.

Са мною ехаў чалавек з Сухавольцаў. Ехалі мы ў Варшаву, але ў Седльцах пабачылі поезд у Чаромху. Прыехалі ў Чаромху, там жыў дваюрадны брат майго таварыша. Пераначавалі ў яго і на другі дзень ён пайшоў у Сухавольцы, а я ў Сасіны. Вярнуўся дадому 27 ліпеня 1947 года.

У мірны час на працягу васьмі гадоў быў я солтысам, дзевяць гадоў быў старшынёю Грамадскай рады ў Снежках. Пасля яшчэ ў Бельску працаваў.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Ваенныя дзеці

Успаміны Мікалая ПЕТЫШУКА з-пад Чаромхі (2)

(заканчэнне)

Была другая палова ліпеня 1944 года. Далёка на ўсходзе адчуваліся водгукі, быцам грымела, хоць неба было чыстае. Пад абед прыехаў на ровары солтыс нашае вёскі (солтыс меў права мець ровар, бо рэшце гаспадароў жандармерыя ровары пазабірала) і загадаў нашаму бацьку даць каня, каб адвезці жандармерыю — ёсць такі загад. Ехаць мае возам у двое коней (Міхаль таксама дасць каня). Як немцы ўцяклі, Міхаль вярнуўся, але конь прапаў.

Пад вечар пачуліся ўзрывы, такія, што шыбы з вокнаў павыпадалі. Гэта ўзрывалі дэпо, будынак станцыі і вадакачку на станцыі Чаромха.

На другі дзень прыйшлі савецкія салдаты, а ў вёсцы пачалася страляніна. У нас за клуняю паставілі чатыры мінамёты, а гэтым усім камандаваў маёр; памятаю, як трымаў ён у далоні трубку тэлефона. Адзін салдат сядзеў у клуні, расхіліўшы салому ў шчыце і назіраў цераз бінокль і падаваў каардынаты мінамётчыкам, куды маюць страляць. Памятаю, як маёр крычаў у трубку: „Дуб, всеми силами помагай Берёзе!" а потым сказаў: „Хозяин, забирай ребятишек, уходите — здесь может быть плохо!"

Тата загадаў: „Танька, адзявай дзяцей!" Мама дала нам штонікі і куртачкі, а мы давай хутка ўсё тое апранаць. Наша сястрычка Валя, якой было два годзікі, сядзела на ложку і сваімі блакітнымі вочкамі паглядала то на нас, як мы адзяваемся, то на маму, і дзівілася, чаму не апранаюць яе. Валечка хацела заўсёды быць з намі і рабіць усё, як мы, яе старэйшыя браты.

У той час бацька расклаў плахту, паклаў у яе плед, загарнуў у ручнічок кавалак хлеба і сала, зрабіў клунак, закінуў яго на спіну і загадаў: „Пайшлі, дзеткі!" Нас было, як я ўспомніў, пецярых хлопчыкаў. Не выйшлі мы яшчэ з падворка, як якіхсьці 200 метраў ад нашае сядзібы разарваўся снарад. Мы хутка пабеглі ў лес, у які ад нашага хлява было нейкіх трыццаць метраў. Забралі мы з сабою дзве каровы, жарабя, тата зняў з плота конаўку і кубак, і так пабрылі мы зараслямі ў сасновы лес — у Таяўкі. За ім была вёска Вулька-Тэрахоўская. Але мы не пайшлі ў гэту вёску, а падаліся ў лес Буркі, а ім дайшлі ў лес Тычыя. Там бацька зрабіў з галля шалаш. Там мы прасядзелі ўсю ноч, а раніцай пайшлі ў вёску Апака, да добрага бацькавага знаёмага, гаспадара Шыдлоўскага. У гэту вёску ўсё прыбывалі людзі з Хлевішчаў, якім удалося ўцячы з лініі фронту. І прыносілі яны ўсё больш трагічныя весткі, што загінула шмат людзей і папалена многа дамоў.

Прыехаў і Мікалай Богач. Са слязамі на вачах расказваў, як у яго прысутнасці забілі яго жонку і двое малых дзяцей. Людзей прыбывала ўсё больш, а вёска Апака — невялікая. Кожны меў сваю сям'ю, цяжка было пракарміць столькі народу. Мама даіла нашых каароў, якіх я раніцай выганяў на апацкую пашу, і карміла малечаў малаком, таксама і свае сяброўкі Нюркі з Хлевішчаў, якая мела малое дзіця. Тая Нюрка была добрай краўчыхай, перарабляла рэчы для дзяцей... Малым дзеткам малака ставала, нам, старэйшым — не. Тата даведаўся, што наша сядзіба цэлая, і на світанні дабіраўся дахаты, прыносіў нам хлеба і сала, накарміўшы цялушачку, якая засталася адна ў нашым хляве. Пасля, пагаварыўшы з мамай, узяў мяне са старэйшым братам на наш хутар, і мы тую цялушачку зарэзалі. Прынеслі мяса ў Апаку. Мама стала варыць суп на мясе, і мы былі ўжо сытыя.

Фронт стаяў на месцы. Людзі ўжо думалі, што гэтаму мучэнню не будзе канца. Урэшце немцы адступілі. Васіль, які быў таксама з намі ў Апацы, сказаў: „Адступілі, бо рускія падцягнулі і зайгралі на «Кацюшах»!"

І так мы, пабыўшы ў Апацы дзён восем, вярнуліся дадому. Будынкі былі ў парадку, найгорш — не было каня і не было чым звозіць з поля збожжа. Як находзіў дождж — дык каня ў суседа не дастанеш: кожны хацеў перад дажджом звезці сваё ў клуню...

Людзі стараліся забыцца пра гора. Моладзь вечарамі збіралася ў кампанію, спявала. Вельмі часта гучалі песні „На позицию девушка провожала бойца", „Всё васильки, васильки — много их выросло в поле" і іншыя. Пачалося нармальнае жыццё. Дзяўчаты вабілі сваімі галасамі кавалераў, а яны шукалі сабе сяброўку жыцця... (лук)

З Бога не насмяешся

Не так яшчэ даўно саветы трубілі ва ўвесь голас, што ўжо скоры час, калі савецкі народ цалкам забудзе пра жывога Бога, а будуць толькі славіць камуністычную партыю і яе правадыроў. І хутка пакажуць у тэлебачанні апошнюю Біблію, якая асталася ў СССР, і таксама пакажуць апошняга веруючага, які астаўся ў вялікім Саюзе. Але так не сталася і тых, што плявалі на Бога, няма ўжо ў жывых і камунізм разваліўся як картачны домік. А народ, хаця бедны, стаў вяртацца да Бога, усюды будуюцца храмы і друкуюцца духоўныя кнігі. Не цуд гэта? Нездарма апостал Павел пісаў калісь у сваім пасланні да галатаў: „Не ашуквайце сябе! З Бога не насмяешся. Бо што чалавек пасее, тое і пажне" (Гал. 6, 7). Камуністы доўга сеялі зло, яно ўкаранілася і сёння праяўляе сваю сатанінскую сілу, але з Божай дапамогай постсавецкія народы перамогуць гэтае духоўнае пустазелле.

Мікалай Панфілюк

Калі вада цячэ з крана

Зімовыя маразы дастаўляюць некаторым людзям не толькі дакучлівы холад. Бывае, што большы мароз скоўвае льдом не толькі рэкі, але і водаправоды глыбока ў зямлі, якія былі пракладзены па-партацку. Такое здараецца на некаторых вуліцах Орлі і іншых вёсак у гміне.

Справа ў тым, што арлянскі водаправод пракладзены заплытка. Для прыкладу, на вуліцах Сянкевіча і Чырвонай Арміі быў ён праведзены раней, чым нівеліравана іх пад новы асфальт і такім чынам трубы апынуліся плыцей. Клопат узнікае тады, калі тэмпература падае пад -20°C — у некаторых дамах вада перастае цячы з крана. А вада ў Орлі вельмі добрая, людзі даўно перасталі карыстацца калодзежамі. Аднак яна найбольш патрэбная для карыстання з кухонных печаў, бо там цагліны на гарачую ваду. Патрэбная яна таксама для папаўнення цэнтральнага ацяплення.

Размарожваннем з дапамогай прапускання электратока адпаведнай сілы займаецца гмінны сантэхнік або самыя жыхары на свой спосаб. Бывалі такія зімы, што сантэхнік займаўся гэтай справай і месяц, бо размарожаная вада хутка зноў замярзала. Спрактыкаваныя і прадбачлівыя жыхары прымяняюць прафілактыку, пакідаючы лёгка недакручаныя краны, каб вада не застойвалася, тады і марозу цяжэй яе скаваць. Былі і такія, што за свой кошт ізалявалі трубы, разбіваючы асфальт на вуліцы.

У агульнасці забяспечанасць вадой у Арлянскай гміне добрая. Ува ўсе вёскі праведзены водаправоды; іх агульная даўжыня (без хатніх адгалінаванняў) складае 38,7 км. На канец 2001 года да водаправоднай сеткі былі падключаны 1 269 жылыя будынкі, што складае каля 90%. У 2001 годзе пастаўлена 198,2 тысяч кубаметраў вады, з гэтага ліку 130,6 тысяч для хатняга карыстання.

Гмінная водаправодная сетка базіруецца на наступных глыбінных студнях: у Крывятычах (забяспечвае адкормачную ферму сельгаскааператыва, вёску Крывятычы і вёску Мора з суседняй Чыжоўскай гміны), у Орлі (вёскі Орля, Шчыты-Навадворы, Шчыты-Дзенцялова, Міклашы, Вулька, Кашалі і Рудуты), у Алякшах адна (Алякшы, Дыдулі, Градалі, Кошкі, Тапчыкалы, Пашкоўшчына, Шарні, Спічкі, Маліннікі, Москаўцы, Чахі-Забалотныя, Рыгораўцы, Паўлінова, Вулька-Выганоўская, Круглая і вёскі ў Боцькаўскай і Бельскай гмінах) і другая (для фірмы „Белавежскія воды"). Варта адзначыць, што вада са студні ў Алякшах характарызуецца найвышэйшай якасцю і не патрабуе ўвыдатнення. Ёсць яшчэ студні для прамысловых мэтаў у Шчытах-Навадворах (былая адкормачная ферма) і ў Орлі (былыя бетанярня і кафлярня).

У сярэднім на аднаго жыхара Арлянскай гміны расходуецца 25,5 кубаметра вады ў год, што з'яўляецца адным з вышэйшых паказальнікаў у Бельскім павеце.

Міхал Мінцэвіч

Уручэнне медалёў

18 снежня 2002 г. у Чаромхаўскім асяродку культуры адбылося ўручэнне медалёў у прызнанні заслуг для абароназдольнасці Рэчы Паспалітай. Гонару ўдастоіліся бацькі, якіх прынамсі трох сыноў служылі ў арміі. Як сказаў камендант Бельскай камендатуры ВКУ падпалкоўнік Мікалай Баршчэўскі, які ўручаў адзнакі, ніводная гміна не дасягнула такога рэкорду. Залатую медаль атрымала маці пецярых сыноў, 54-гадовая Вольга Салінская з вёскі Чаромха. Трыццаці шасцярым асобам былі ўручаны сярэбраныя медалі. Найстарэйшымі ўзнагароджанымі былі Аляксей Лук'янюк, Павел Рожук і Эдуард Хандзынскі. Наймалодшая ўдзельніца сустрэчы, гэта Вольга Салінская. Гміна сарганізавала сціплы пачастунак. Шкада, што арганізатары не задбалі пра мастацкую частку, хаця б з удзелам школьнай моладзі. Падпалкоўнік Мікалай Баршчэўскі павіншаваў узнагароджаных і іх сыноў ад імя міністра абароны. Ад імя мясцовага самаўрада ўзнагароджаных павіншавала сакратар гміны Валянціна Кердалевіч.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Сярэбраны медаль атрымалі Еўдакія і Мікалай Шатыловічы

Уладзімір Сідарук

Нараўчанская гміна

Вулічнае асвятленне толькі да 22^{00} гадзіны

Вулічнае асвятленне ў вёсках Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) дзейнічае вечарам толькі да гадзіны 22^{00}. Ну што ж, трэба ўсюды ашчаджаць, дык ашчаджаем. А што аблягчаем занятак зладзеям ды пагаршаем бяспеку на вуліцы, гэта, мабыць, другарадная справа. Бывае ж.

А вось іншая праблема і паддаю яе пад развагу. Хто ўвогуле клапоціцца пра вулічныя электраўстаноўкі? Я хацеў бы ведаць, чаму яны забытыя, напрыклад, у Нараўцы, Старым Ляўкове і ў Новым Ляўкове. Тут над электралямпамі знаходзяцца г.зв. тэхнічныя кажухі або экран, які засланяе ад дажджу ці снегу, ды і служыць для таго, каб святло накіраваць уніз і перш-наперш на вуліцу. Пра гэтыя экраны прынамсі ў нашых мясцовасцях ніхто не клапаціўся раней ды і цяпер нават не падумае. А яны ж адбіваюць — калі новыя — святло электралямпачак. Калі чыстыя, таксама. Але запыленыя, закураныя ды паіржавелыя, з якіх адпала белая эмаль — не. У такім выпадку нават моцная лямпачка блішчыць-свеціць цьмяна. А можа быць інакш, калі электраўстаноўку пачысціць, ды некаторыя экраны памяняць. Тады і электраэнергіі менш затрачвалася б. Была б жаданая ашчаднасць. А мо тады вулічнае асвятленне выключалі б сама менш недзе апоўначы? А так блісне на некалькі гадзін і патухне. А ноч зімняя доўгая.

Янка Целушэцкі

Вер – не вер

Добры дзень Вам, Астроне!

Прысніўся мне дзіўны сон пра суседку маёй бабулі, якая ўжо вельмі старэнькая, сівенькая і, як я чула, апошнім часам крыху хварэе... Вось я была на панадворку ў маёй бабулі, але бабулі там не было. Я пабачыла, што гэтая згорбленая старавінка ідзе да нас. Я амаль паляцела, каб адкрыць ёй браму. Гэтая бабулька малая, але мне здалася яшчэ меншай. Я спытала, ці чагосьці ёй не трэба, ці можа даць ёй нешта з'есці, у чымсьці дапамагчы?.. Гэта не было зусім нармальнае, бо я яе не вельмі люблю. А яна пачала плакаць, як дзіця — быццам узрушана, што я хацела ёй дапамагчы. Яна ўсё плакала і дрыжала, а я яе прытуліла і хацела супакоіць. А яна чым больш плакала, тым меншая мне здавалася і вось я ўжо трымала яе ў руках, як дзіця. Мне было сумна. Калі бабулька ўстала, яна дасягала мне ўжо толькі да кален! Я пайшла за ёй у нейкі садок, дзе было мокра і цёмна. Яна вяла мяне драўлянымі кладачкамі па балоце, пакуль мы не дайшлі да шопкі без сцяны, такой малой, што і сесці там цяжка было б. Тым часам бабуля заплакала, што яе дзеці сказалі ёй тут жыць, а тут жа холадна, дождж і вецер уваходзяць праз дзіркі ў сценах, „а яна ўжо старая і хворая". Помню толькі, што мяне знервавала такая няўдзячнасць дзяцей і я прысягла адпомсціць за бабуліну крыўду...

Але, што гэты сон можа абазначаць? Ці ён сапраўды звязаны з суседкай, ці можа з маёй прабабуляй, якая на яе падобная, ці можа яшчэ маю разумець, што я сама павінна змяніць свае адносіны да бацькоў?

Шчырыя і цёплыя пажаданні Вам

Ваша маладая чытачка Зося

Даражэнькая Зося! Твой сон гаворыць пра нейкія клопаты, цяжкасці ў справах, бо тая старая была згорбленая і меншала на тваіх вачах (а мо, пакуль я сабраўся з адказам, дык тая старэча ўжо памерла?..).

Ясна адно, што тыя праблемы, якія ўзніклі ў тваім жыцці, ты ўжо даўно перамагла. Аб гэтым яскрава сведчыць той факт, што ты прыласкала чужую бабульку, хаця і не вельмі яе любіла, але асабліва істотны ў гэтых адносінах з'яўляецца яе плач. Тое, што было тваёй праблемай, можа стаць тваёй радасцю.

Астрон

Папраўка

У 1 нумары „Нівы" былі намі дапушчаны памылкі ў подпісах пад здымкамі, што заўважыла Зося Лемеш і прыслала нам удакладненні. На здымку на 1 старонцы гістарычныя ўборы радзівілаўскай эпохі прэзентавалі не гайнаўскія ліцэісткі, а толькі адна ліцэістка (Зося Лемеш — у цэнтры), выпускніца гэтага ж ліцэя (Анна Садоўская — з правага боку) і студэнтка з Мінска (Ірына — з левага боку). А на здымку на 4 старонцы настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі з Гайнаўкі стаіць не з гімназістамі, а толькі з ліцэістамі — удзельнікамі алімпіяды па беларускай мове.

У зацікаўленых асоб і чытачоў просім прабачэння.

Рэдакцыя

Ёзік на выбарах

Захацеў наш Ёзік
Радным гмінным быці.
Пачаў ён ізранку
Усіх людзей вазіці.

Пад касцёл, пад царкву
Стаў сам пад'яжджаці:
„Ходзьце, завязу вас
На мяне голас даці.

Ну, і на маю Гапку
Трэба голас даці:
Будзе добрым войтам,
У гміне парадак трымаці".

Ён сваім падуладным
Мішы, Вані, Віці
Загадаў на ўчасткі
Выбаршчыкаў вазіці.

Так Ёзік да гміны
На раднага ўбраўся,
Толькі з сваёй Гапкай
Навек развітаўся.

Цяпер Ёзік кажа:
„Што маю рабіці,
Калі наша Гапка
Не можа войтам быці?"

Абяцаў асфальтам
Зліць сцежкі, дарожкі,
Каб было добра ездзіць
Да роднае вёскі.

А цяпер аб гэтым
Добра Ёзік знае:
Няма Гапкі войтам
Ніц ён не здзялае.

І для бізнесмена
Будзе горай жыці:
Не пойдзе у гміну,
Каб льготу здабыці.

Вось якія людзі
У нас яшчэ бываюць.
Хоча ўлезці ў раду —
Усяго наабяцае.

Мікалай Лук'янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка



www.ohmygoodness.com

Расхадуха

Апошнюю чарку за бяседным сталом у розных народаў спрадвек называлі парознаму. Нашы суседзі, палякі, пілі *czarkowego*, расейцы — вялікія аматары ўкленчыць шкляному богу — пілі чарку *стрэмянную*, пры стрэмені, пасьля чаго госьць мусіў закінуць нагу на каня, пілі й *на пасашок*, стоячы на парозе.

Беларусы ж апошнюю чарку ахрысьцілі бадзёрыста — *расхадуха*, і выпіўшы яе, павінны былі разыходзіцца па хатах. А паколькі ў савецкай імпэрыі час ад часу арганізоўваліся кампартыйна-паспалітыя рушэньні супраць п'янства, то слова *расхадуха* апынулася ў разрадзе крамольных і не патрапіла ў нарматыўныя слоўнікі. А шкада.

І сёньня на дзяржаўным радыё можна пачуць саладжавую песеньку ў выкананьні псэўдафальклёрнага гурту:

Чарка „на пасашок" — на марозе кажушок,
А за ёю новая — чарка „аглаблёвая"...

Зрэшты, і апошніх чарак можа быць некалькі. Асабліва калі сабралася добрая сябрына, не апарожнены дарэшты посуд на стале, а над душою, як гасьцінная гаспадыня, стаіць у думках прыказка: „пі ды еж, бо як памрэш — калом не ўвапрэш".

Пашануйце знаёмых, выпіце „аглаблёвую", а калі застольле й сапраўды мае скончыцца, узьніміце *чарку-расхадуху* за веліч і сілу беларускага духу.

Міхась Скобла
(паводле „ARCHE", 7/2000)

Удвозе на возе

Якая шкода — не можам прыняць удзел у тых тэлеіграх, якія нас цікавяць. Мяне і Агату. Бо, пэўна, телегледачам больш прыемна пабачыць маладыя, гладкія, вясёлыя твары. А нашы маршчыны, хоць натуральныя і самі па сабе нястрашныя, не з'яўляюцца атракцыёнам для мільёнаў. Хіба што зробім з сябе смеху крыху, праспяваўшы з табліцы ў „Шанцы на поспех"...

— Выступай дзе хочаш, — сцвердзіла мая жонка. — Толькі з сябе смеху не рабі. Але навукова даведзена, што кабеты маюць іншы розум...

— Ну-у-у! — пацвердзіў я, зусім без злосці. — Але ж колькі філосафаў, ну, мудрацоў было ў гісторыі... А кабет?..

— Мозг жанчыны настаўлены на стварэнне новага жыцця і падтрымліванне ўсяго ў гармоніі. Каб парадак быў. Каб у свеце па-божаму было...

Ну, думаю, па-айшло-о-о!

— Вось, рабілі доследы такія амерыканскія навукоўцы. Далі людзям рознага ўзросту, а было там найбольш пажылых, на пару гадзін шмат задач. На лагічнае мысленне, на развязванне праблем. Рознага тыпу — моўных, лагічных, з рознымі варыянтамі... — Агата аж захлябнулася, пералічваючы. — І ведаеш, што большасць мужчын, калі не спраўляліся з задачай, зракаліся рашаць далей? Злаваліся, выходзілі на перакур, урэшце кідаліся ў такую злосць, што не ўдаецца, і ўвогуле ішлі прэч. А жанчыны памаленьку развязалі ўсё. Асабліва бабулькі выпалі добра...

— Ну, бабулька Агатка! — крыху пасміхнуўся я. — Цікава, што хто зробіць, калі грошай няма. Альбо калі знойдзецца раптам у эміграцыі, без знаёмства, без ведання мовы. Выпусці цябе, вось, у Амерыку...

— А пусціш? То пра каго будзеш пляткаваць амаль штотыдзень у сваёй „Ніўцы"?.. Ага, і ўяві сабе, Ваня, і, мабыць, табе будзе прыкра, як мужчыну... Падключылі тады ўсіх мазгі да апаратаў... І аказалася, вось, такое: калі жанчына рашае любую задачу, працуюць у яе абодва паўшар'і, усе часткі мозгавай кары, чым бы яны не займаліся. А мужчына ўключае толькі тое, што трэба. Калі задача на ўяўленне, дык выкарыстоўвае тую частку мозгу, якая адказвае за гэта. Калі за памяць — толькі частку па справах памяці...

Я схапіўся за сваю галаву.

— Хочаш сказаць, Агатка, што калі я ўспамінаю нашы маладыя гады, дык не ўключаю ўяўлення? Або калі памагаю рабіць табе нейкі салат, дык трымаюся рэцэпту, а новыя варыянты ды эксперымент гэта ўжо не для мяне?..

— Ну, Вандал, ты яшчэ не такі і звычайны мужык. За сорак пяць гадоў нашага супольнага сужыцця мела на цябе пазітыўны ўплыў тое, што жыў з такою бабаю як я.

Тут Агата выпнула наперад свае грудкі і шырока ўсміхнулася. Мне і злавацца не выпадала. Мабыць, крыху праўды ў тым і ёсць. Ды крыўдна ж за мужыкоў — праўда, гэтак сцвердзілі навукоўцы? Яшчэ і амерыканскія? Дык чаму ж жанчыны не займаюцца так, як маглі б, напрыклад, палітыкай? Тут жа ж трэба галаву наламаць! Замест спадара Калодкі даць звычайную Тэклю, якая з нічога зробіць усё, і з вялікай бюджэтнай дзірай пракоміць сям'ю дый яшчэ заінвестуе... Гэтак я падумаў, а Агата, мабыць, уключыўшы яшчэ інтуіцыю і нутраны слых, сказала:

— Ну, а каб так твая Агата Арлянская стала міністрам фінансаў?..

Вандал Арлянскі

Факты і высновы

Rozśpiewana Białoruś

Цэзараму Галінскаму, карэспандэнту „Выбарчай" у Мінску, не падабаецца не толькі месца прабывання, але і новы беларускі гімн. Насміхаючыся з папулярызацыі дзяржаўнага сімвала ў беларускім тэлебачанні, піша: „z pieśnią na ustach pojawiali się studenci, ozdobieni siwizną i orderami weterani, przedstawiciele klasy robotniczej i inteligencji twórczej. Nie zapomniano też o mniejszościach — hymn śpiewał i Żyd w jarmułce, i Tatarka, wąsaty Ukrainiec bratał się z Rosjaninem. Wśród postaci w strojach ludowych zabrakło krakowskiego piórka".

Дзіўная ідэнтыфікацыя. Выходзіць, што ў Беларусі няма вусатых беларусаў, а польскую меншасць пазнаюць па рагатых кракаўскіх кепках з паўлінавым пёркам. Няўжо ў тых „кракусаў" няма мясцовай нацыянальнай рыскі?

Ай, Цэзары, Цэзары — пратры акуляры!

Сідар Макацёр

Адгаданка

А:

1	2	3	4	5

В:

А	С	Ч	І	Е
Б	Ў	Ц	З	Ў
Г	А	Р	А	Р
Ы	Ў	В	А	Д
А	Я	Д	Ы	М

Б:

1	2	3	4	5

Г:

Адгаданыя пяцілітарныя словы трэба запісаць у калонкі роспісу А. Затым, шляхам перастаноўкі літар, утварыць з іх новыя словы, якія пасля запісаць у калонкі роспісу Б. Літары з калонак роспісу В пераставіць у роспіс Г такім жа чынам, як былі перастаўлены літары з роспісу А ў Б. Рашэнне адгаданкі атрымаецца ў радках роспісу Г.

1. сталіца Афганістана, 2. Уладзімір, беларускі паэт (1900-33), 3. моцная снегавая завіруха, 4. работнік касы, які прымае і выдае грошы, 5. буйная няпарнакапытная жывёла трапічных лясоў з выцягнутымі ў невялікі хобат верхняй губой і носам (*Tapirus*). (Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 48 нумара

Гарызантальна: буквар, зарніца, рыцына, Рагнеда, Накуру, Ніксан, авакада, начлег, аракача, Байран.

Вертыкальна: дзёран, трагік, хімера, баран, коцік, Аснар, ахапак, ураган, Уласаў, Ітака, сілур, наган.

Рашэнне: **У сваёй хаце і качарга маці**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Лес адчыняецца

Мядзведзь Сандар Жоржавіч усё ранне крочыў па сваёй бярлозе ўзад ды ўперад.

— Ну і зіма! Увесь лес засыпала. Штосьці тут трэба прыдумаць дзеля лясного люду. Трэба ж штосьці есці. Калі есці не будзе, дык павыздыхае, і хто на мяне голас аддасць? То ж не змяя Ссапія ды не вуж Ззянон, — такія думкі не давалі яму супакою, дык ніяк не прыходзіла на яго азарэнне.

Выкарабкаўся ўрэшце перад поўднем на паляну, на чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. Яго схуднелыя сябры ўжо чакалі свайго правадыра. Сандар моўчкі акінуў зрокам ледзь не млеючую лань Гаўрусіху, прыкмеціў абвіслую кіту вавёркі Кацюшы і дзіка Свіналыча, якога лыч ад слабасці ўткнуўся глыбока ў снег.

— Ой, нядобра, мае вы каханыя, нядобра, — уздыхнуў Сандар Жоржавіч.

Дзяцел Стукач вяла падтакнуў дзюбай. Толькі ў яго было столькі энергіі, каб зрабіць нейкі, хоць слабы, жэст. А адкуль у яго магла быць энергія, ніхто не ведаў, ну, можа і не ўсе ведалі, толькі ў нікога не было адвагі, а можа і сілы, каб пра гэта сказаць. Нікога, дарэчы, гэта не здзіўляла: Сандар Жоржавіч і яго найбольш даверaны дзяцел мусяць трымацца разам, бо хто ж павядзе ў будучыню лясную брацію?

— Мядзведзь ты наш любімы, учыні штосьці, памажы, сілы ў нас няма, а зіма яшчэ такая до-оўгая, — шэптам прасіпела лань, поўная бязмежнай веры ў свайго мішутку.

— Я думаю, Сандар наш найдаражэйшы, што трэба нам звярнуцца да кіраўніцтваў з-па-за нашага лесу: хай інвестуюць, хай прывязуць нам тое, што ў нас схавана пад гурбамі снегу. Давайце, адкрыем нашы паляны і ўзлескі! — кінуў быццам няхочучы Стукач.

— Ну, ды як жа гэта... Адкрыем, а яны пачнуць нам дыктаваць, распытваць, дзе мая бярлога?! — занепакоіўся Жоржавіч.

— Не бойся нічога! Вясною ўсё будзе так, як было. Мае будуць падтрухваць за чужымі. Прыдзе час — штосьці на кожнага вывалачэм, і пагонім з лесу.

Мядзведзь на хвілінку задумаўся. І ўбачыў, што ніхто, апроч дзятла, не мае сілы канструктыўна выказацца ў дыскусіі.

— Ну, хай так і будзе, — рашыў наканец і пашлэпаў назад у бярлогу. На абед.

* * *

На змярканні над лесам несліся незнаёмыя тут гукі. Гэта інвестыцыі наплывалі з усіх бакоў: ад Уладзімірскага лесу аж да Швальцвальда. Плылі, плылі, плылі... Іх гук нёсся ў марозным паветры рэгулярна ды аднастайна. Гук, за якім чуваць было вялікую спажыву-нажэрку, аж, здавалася, чуеш ужо на яе фоне смачнае чмяканне ды плямканне. Аж штосьці парушыла гэтую асалоду...

Лань Гаўрусіха страсянула ілбом. Расплюшчыла вочы. Гэта ёй толькі снілася. Аблізала дакладна сваю пысу, па якой сцякала галодная сліна. Увесь жа адвячорак снілася ёй, і яна гэтак чмякала ды плямкала...

МакХолад

ISSN 0546-1960